Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПЯТНІЦА
24 ліпеня 1931 г.
№ 168 (3257)

За адзіны плян культурнага будаўніцтва

Перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, якія краіна саветаў атрымала за апошнія гады, далі вялізарнейшую магчымасьць узьняць матар'яльны і культурны ўзровень рабочых калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас. Побач з ростам нашай сацыялістычнай прамысловасьці, побач з ростам сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, расьце і ўзьнімаецца ўсё вышэй і вышэй матар'яльнае і культурнае становішча працоўных мас.

Асабліва вялізарныя дасягненьні ня толькі на фронце гаспадарчага будаўніцтва, але і на фронце стварэньня культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце, атрымалі нацыянальныя акраінныя савецкія рэспублікі. БССР, дзякуючы правільнаму і пасьлядоўнаму ажыцьцяўленьню Ленінскай нацыянальнай палітыкі, дзякуючы сыстэматычнай дапамозе пралетарыяту ўсяго Савецкага Саюзу, на фронце культурнага сацыялістычнага будаўніцтва атрымала нябачныя дасягненьні. 10-гадовы юбілей вышэйшай школы БССР, які нядаўна адзначаўся шырокай грамадзкасьцю Савецкага Саюзу, зьяўляецца найяскравейшым паказьнікам той вялізарнай работы, праробленай камуністычнай партыяй і савецкай уладай у справе культурнага будаўніцтва, у справе падвышэньня палітычна-культурнага ўзроўню працоўных мас Савецкай Беларусі.

Культпаход, які праводзіўся на працягу апошняга году ў форме культэстафэты зьяўляецца адным з самых магутных сродкаў мабілізацыі мас на практычнае вырашэньне дырэктыў партыі і ўраду па пытаньні аб культурным будаўніцтве. Асноўны вынік культэстафэты зводзіцца к таму, што рабочыя, калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы шчыльна падышлі да культурнага будаўніцтва і пад кіраўніцтвам партыі змагаюцца за бальшавіцкія тэмпы на гэтым адказьнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Зараз праводзіцца другі этап культэстафэты. Асноўная задача другога этапу культэстафэты—мабілізацыя мас на баявую падрыхтоўку да новага навучальнага году. Да пачатку новага навучальнага году засталося зусім мала часу. І ня гледзячы на гэта, падрыхтоўка да новага навучальнага году праходзіць няўдарнымі тэмпамі. Пакуль што не адчуваецца такога становішча, каб падрыхтоўка да новага навучальнага году стаяла ў асяродку ўвагі савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый.

Цэнтральны ўсебеларускі штаб культэстафэты вынес пастанову аб правядзеньні двухдэкадніка трывогі па ліквідацыі прарываў на фронце падрыхтоўкі да новага навучальнага году, на фронце культурнай рэвалюцыі. Па пытаньні правядзеньня другога этапу культэстафэты і двухдэкадніка трывогі, па лініі культпропу ЦК і ЦКК КП(б)Б на месцы даны адпаведныя дырэктывы, якія абавязваюць гаркомы, райкомы і РКК КП(б)Б узяць культэстафэту другога этапу пад сваё непасрэднае кіраўніцтва і пад свой сталы кантроль. Трэба раз назаўсёды запомніць, што першачарговую адказнасьць за ўсю работу ў тым ліку і за культурнае будаўніцтва ў гарадох і раёнах нясуць партыйныя арганізацыі.

Падрыхтоўка да новага навучальнага году зьяўляецца складанай часткай баявой вытворчай праграмы 3-га рашаючага году. Бальшавіцкія тэмпы, якія паказвае наша прамысловасьць у барацьбе за прамфінплян, павінны быць перанесены і на фронт падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Трэба самым рашучым чынам пакончыць з безадказнасьцю, бюракратычнай валакітай, з апартуністычнай стаўкай на самацёк і ў справе падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Па тым, як гарады і раёны справяцца з задачай своечасовай і дабраякаснай падрыхтоўкі да новага навучальнага году, можна будзе судзіць аб іх здольнасьці змагацца за пасьпяховае вырашэньне дырэктыў партыі і ўраду па пытаньні культурнага будаўніцтва.

Баявы вучастак культурнага будаўніцтва адстае ад ударных тэмпаў усяго сацыялістычнага будаўніцтва. На сёньняшні дзень адсутнічае адзіны плян. Вялізарнейшыя сумы сродкаў на культурна-масавую работу, на культурнае будаўніцтва трапяцца кожны год па лініі прафсаюзаў, савецкіх установ і розных грамадзкіх арганізацый, што ўносіць у гэтую справу вялікую неразьбярыху і бяспляннасьць. Так справа далей працягвацца ня можа. Трэба зараз-жа прыступіць да складаньня адзінага пляну культурнага будаўніцтва, на якім павінны выдаткоўвацца ўсе сродкі, вызначаныя на мэты культурнага абслугоўваньня працоўных мас.

Зараз БССР прыступіла да падрыхтоўкі матар'ялаў для складаньня другой пяцігодкі. У пляне другой пяцігодкі сацыялістычнае культурнае будаўніцтва займе значна большае месца, чым зараз. Трэба ўзьняць насы на практычны ўдзел у справе падрыхтоўкі матар'ялаў для складаньня другой пяцігодкі. Газэта «Савецкая Беларусь» у адказ на заклік газэты «Чырвоная Зьмена» на сваіх старонках праз пару дзён адкрывае ўсебеларускую канфэрэнцыю-пераклічку па пытаньні падрыхтоўкі да новага навучальнага году, па пытаньні падрыхтоўкі матар'ялаў па культурным будаўніцтве для складаньня другой пяцігодкі. Ва ўсебеларускай канфэрэнцыі-пераклічцы павінны прыняць найактыўнейшы ўдзел саветы, прафсаюзныя, гаспадарчыя, камсамольскія арганізацыі і ўся савецкая грамадзкасьць.

Фронт культурнай рэвалюцыі—фронт бязьлітаснай клясавай барацьбы. Культурная рэвалюцыя зьяўляецца складанай часткай усяго сацыялістычнага будаўніцтва.

ЗАДАНЬНЕ ПАВІННА БЫЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАНА

Пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі краіна саветаў ператвараецца з краіны адсталай і аграрнай ў краіну перадавую, краіну буйнай індустрыі, суцэльнай калектывізацыі і суцэльнай пісьменнасьці. Наша краіна стала краінай самай буйнай машынізаванай сельскай гаспадаркі ў сьвеце.

3-ці рашаючы год пяцігодкі зьяўляецца годам завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў краіне саветаў. 518 новых фабрык і заводаў уваходзяць у строй. 1040 машынатрактарных станцый будуць працаваць на калгасных палёх.

Пасьпяховае выкананьне гэтых задач патрабуе максымальнай мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў працоўных Савецкага Саюзу. Краіна саветаў ня можа спадзявацца на грашовую падтрымку з боку буржуазных краін. Каліталістычны сьвет не зацікаўлены ў сацыялістычным будаўніцтве, а наадварот, для зруйнаваньня гэтага будаўніцтва рыхтуе супроць нас вайну.

Забясьпечыць грашовымі сродкамі выкананьне пляну вялікіх работ сацыялістычнага будаўніцтва 3-га рашаючага году пяцігодкі—ганаровы абавязак усіх працоўных гораду і вёскі.

Выпушчаная ўрадам па патрабаваньні перадавых атрадаў рабочае клясы і калгаснікаў пазыка 3-га рашаючага году пяцігодкі зьяўляецца магутным укладам у сацыялістычнае будаўніцтва. Праз пазыку забясьпечым рост гаспадарчага і культурнага будаўніцтва нашае краіны. З агульнай сумы рэалізаванай пазыкі 30 проц. адлічваецца ў сельскі і 20 проц. у раённы бюджэты на мясцовыя патрэбы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва гораду і вёскі.

Рабочая кляса з энтузіязмам сустрэла пастанову ўраду аб выпуску пазыкі і сапраўды ўдарнымі бальшавіцкімі тэмпамі правяла ў сябе падпіску, даўшы ў пазыку дзяржаве 25 млн. 150 т. руб., што складае 107,5 проц. заданьня на рабочых і служачых БССР.

Рэалізацыя пазыкі на вёсцы—другі важнейшы і адказьнейшы этап кампаніі. Па прыкладзе гораду рэалізацыя на вёсцы павінна быць праведзена сапраўднымі бальшавіцкімі тэмпамі пры самым шырокім і актыўным удзеле ўсёй грамадзкасьці як гораду, так і вёскі, асабліва пры актыўным удзеле як цэнтральнага, так і мясцовага друку.

Ударны дэкаднік, які праводзіцца з 20-га ліпеня, завяршыць кампанію і забясьпечыць поўнае выкананьне заданьня па рэалізацыі пазыкі на вёсцы па БССР у суме 16 млн. руб.

Заданьне вельмі значнае, аднак зусім рэальнае і павінна быць поўнасьцю выканана.

КАЛГАСЬНІКІ І ЎДАРНІКІ ПАЛЁЎ! Не адставайце ад рабочых, пакажэце прыклад бальшавіцкіх тэмпаў у падпісцы на пазыку. Зрабецеся арганізатарамі рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў—заўтрашніх калгаснікаў, разгарнеце сацспаборніцтва, вылучце з свайго асяродку ўдарнікаў, ударныя штурмавыя брыгады, арганізуйце грамадзкі буксір адстаючым, работу правядзіце пад лёзунгам: «ніводнага калгасьніка і аднаасобніка, які не падпісаўся-б на пазыку ў разьмерах ня менш 3-тыднёвага даходу». Пачын калгаснікаў—лепшы прыклад для ўсёй масы працоўнага сялянства і гэты пачын павінен быць забясьпечаны абавязкова.

РАБОЧЫЯ САЎГАСАЎ І МТС! Станьце на перадавую лінію падпіскі на пазыку і аканжце практычную дапамогу і ўплыў сваім прыкладам на рэалізацыю пазыкі сярод працоўнага сялянства.

КАЛЕКТЫВЫ РАБОЧЫХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ!—Вы тады выканаеце поўнасьцю свае абавязкі перад дзяржаваю, калі забясьпечыце поўнасьцю пасьпяхавую рэалізацыю пазыкі на вёсцы.

ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ! Ударнікі, камсамольцы, вы, якія паказалі бальшавіцкія прыклады работы ў выкананьні дырэктыў партыі па важнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, павінны стаць перадавікамі ў рэалізацыі пазыкі на вёсцы. Будучы прыкладам у асабістай падпісцы, арганізуйце рэалізацыю сярод беспартыйнай моладзі і дарослага працоўнага насельніцтва, выканайце загад Цэнтральнага Камітэту ленінскага камсамолу—«кожны камсамолец павінен завербаваць ня менш 6 падпішчыкаў на аблігацыі пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі».

КАМІСІІ САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ ДЗЯРЖКРЭДЫТУ і ашчадной справе! На вас урадам ускладзена адказьнейшая задача—рэалізаваць пазыку на вёсцы. Згуртуйце актыў вакол правядзеньня кампаніі. Расстаўце свае сілы такім чынам, каб поўнасьцю забясьпечыць абслугоўваньне ўсіх пунктаў рэалізацыі пазыкі. Арганізуйце і актывізуйце кадры грамадзкіх інструктароў, падцягвайце адстаючых, выяўляйце і прэміруйце лепшых актывістаў, праявіўшых сябе ў рэалізацыі пазыкі. Устанавіце нагляд за паступленьнем грошай па падпісцы і прасоўваньнем гэтых сродкаў ад пазыкатрымацеляў да крэдытных устаноў. Арганізуйце шырока абслугоўваньне пазыкатрымацеляў. Давядзеце ў парадку цьвёрдых заданьняў пазыку да ўсіх кулацкіх гаспадарак і мэтадамі грамадзкага ўзьдзейнічаньня забясьпечце поўнае выкананьне гэтых заданьняў.

ЧЫРВОНАШТАНДАРНАЕ НАСТАЎНІЦТВА! Вы, ударнікі культурнага фронту, павінны прыняць актыўны ўдзел у рэалізацыі пазыкі на вёсцы; вы павінны дапамагчы сваім актыўным удзелам, прыкладам вясковым арганізацыям правесьці шырокую растлумачальную работу аб пазыцы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў. Зрабеце хатычытальні, клюбы, школы і інш. культурныя ўстановы цэнтрам штодзённай агітацыйна - растлумачальнай работы аб дзяржпазыках, забясьпечце ўкараненьне ў шырокія пралетарскія масы вёскі ідэі дзяржкрэдыту і ашчаднай справы.

РАБСЕЛЬКОРЫ! Мабілізуйце шырокія масы працоўнага сялянства на пасьпяховую рэалізацыю пазыкі на вёсцы, асьвятляйце ў друку лепшыя ўзорныя прыклады работы, крытыкуйце недахопы, дабіваючыся іх зьнішчэньня, забясьпечце пасьпяховую рэалізацыю пазыкі на вёсцы.

РАБОТНІКІ ФІНАНСАВА-КРЭДЫТНАГА АПАРАТУ! Арганізуйце чоткае і лепшае абслугоўваньне пазыкатрымацеляў. Забясьпечце своечасова ўсе арганізацыі агітацыйна-справачнымі і апэрацыйнымі матар'яламі, а таксама аблігацыямі пазыкі. Арганізуйце практычную дапамогу сельсаветам, камсодам, калгасам у пастаноўцы вучоту і парадку афармленьня падпіскі, дамагаючыся своечасовага і правільнага афармленьня падпіскі і паступленьня плацяжоў. Арганізуйце жывы інструктаж і дапамогу нізавым арганізацыям у правядзеньні кампаніі па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, разгортваньнем шырокай агітрастлумачальнай работы на ўмовах поўнай добраахвотнасьці і, даючы рашучы адпор кулацкай агітацыі, падцягваючы шляхам грамадзкага буксіру адстаючыя арганізацыі практычнай дапамогай гарадзкіх пралетарскіх арганізацый,—хутка і поўнасьцю рэалізуем пазыку 3-га рашаючага году пяцігодкі на вёсцы.

Актыўным удзелам усёй савецкай грамадзкасьці выканаем і перавыканаем заданьне па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Праз пазыку дамо новыя мільёны на сацыялістычнае будаўніцтва.

Ніводнага калгасьніка і аднаасобніка на вёсцы без аблігацыі пазыкі.

Народны Камісар Фінансаў БССР
А. ЎАЦКЕВІЧ.

22-VII—31 г.
г. Менск.

Палявыя газэты—на фронце ўборкі

Ельскія рабселькоры па-баявому ўзяліся за рэалізацыю пастаноў рабселькораўскага зьезду

ЕЛЬСК. (Наш карэспандэнт). Надоечы ў Ельскай райКК РСІ быў заслуханы даклад дэлегацыі 2-га Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

На дакладзе прысутнічалі работнікі нізавога друку, насьценгазэт і раённых актыў, па-за штатныя інспэктары РСІ, брыгадзіры МК.

Даклад быў пабудаваны так, каб высьветліць задачы нізавога друку на даным этапе і ролю штодзённых палявых калгасных газэт «Ударнік уборачнай».

З вялізарнейшым энтузіязмам выступілі калгаскоры па пытаньні штодзённых калгасных газэт: як найхутчэй цусьціць у масу газэту з тым, каб не пазьней 19 ліпеня газэты былі на палёх раёну Ельшчыны.

Поруч з гэтым грамадзкая думка ўсяго актыву згуртоўвалася на тым, каб таксама належным чынам праверыць тэрмінова рух і пашырэньне нізавога друку ў раённых установах, вывучыць характар і напрамак існуючых газэт, як яны змагаліся за выкананьне прамфінплянаў і ўсіх пастаўленых задач.

Усю работу па перабудове нізавога друку як у цэнтры раённых устаноў, таксама і па ўсім раёне рабкоры-сьценкоры сумесна з актывам райКК РСІ намецілі правесьці ў трох дзённы тэрмін, каб абавязкова праламіць у жыцьцё гэта мерапрыемства як адзін з мэтадаў барацьбы з усякага роду злачынцамі, апартуністамі, лодырамі і лежабокамі, якія служаць тормазам у выкананьні намечаных тэмпаў.

Для праверкі і перабудовы, а таксама і арганізацыі новых газэт вылучана 5 ударных брыгад. Да 23 ліпеня будзе ахоплена газэтамі 42 калгасы, 7 сельсаветаў і 12 раённых устаноў. Усяго будзе працаваць па гэтай рабоце 45 чалавек.

Санюкоўская парт'ячэйка першая ў раёне па-ўдарнаму прыступіла да гэтай работы, прычым за адзін дзень 18 ліпеня, навакол газэт «Ударнік уборачнай» створана ў 3-х калгасах новых 9 ударных брыгад.

Газэты сталі арганізатарам мас у разьвіцьці ўдарніцтва. Гэты вопыт Санюкоўская ячэйка КП(б)Б перакінула ў астатнія ячэйкі раёну—Скараднянскую, Рамезаўскую, Кочыцкую і Ельскую.

Каб дэталёва вывучыць формы і мэтады работы палявых газэт у калгас «Чырвоны Ельск» вылучана спэцыяльная брыгада камсамольцаў, прыехаўшых студэнтаў для дакладнага дасьледваньня арганізацыі мас на практыцы.

Рабкоры Ельскага раёну пад кіраўніцтвам райкому КП(б)Б выканаюць узяты на сябе абавязак—паставіць нізавы друк на вышыню, каб друк стаў арганізатарам масы вакол пастаўленых задач 3-га рашаючага.

Чарговая канфэрэнцыя па „адратаваньні" Нямеччыны

Супярэчнасьць паміж імпэрыялістычнымі драпежнікамі абвастраецца

Адкрыцьцё Лёнданскай канфэрэнцыі

ЛЁНДАН, 20-7. Лёнданская канфэрэнцыя адкрываецца сёньня, а 6 гадзіне ўвечары. На першым паседжаньні будзе вызначана праграма канфэрэнцыі і створаны камісіі. Хоць палітычныя пытаньні і будуць выключаны з парадку дня канфэрэнцыі, аднак бязумоўна на іх будзе згрупавана асноўная ўвага міністраў ва ўсіх іх неафіцыйных перагаворах. За кулісамі канфэрэнцыі будуць працягвацца франка-нямецкія перагаворы. У сувязі з гэтым дыплёматычны рэдактар «Дэйлі Геральд» працягвае выразна намякаць, што шлях да згоды ляжыць у прадастаўленьні Нямеччынай неафіцыйных гарантый. «У гэтым,—піша газэта,—адначасова і абавязак і перавагі Нямеччыне: яна можа добраахвотна аказаць значную дапамогу агульнай справе».

Газэта далей адзначае, што думка аб «палітычным мараторыі» ўсё яшчэ зьмецай, што «ў сучасны момант мараторыі мяркуецца распаў сюдзіць ня толькі на Нямеччыну, але і на ўсіх эўрапэйскіх удзельнікаў канфэрэнцыі, і што далучыцца да гэтага мараторыя будзе дазволена ўсім іншым эўрапэйскім краінам. Быць можа, дзякуючы Гендэрсону ў выніку парыскіх і лёнданскіх перагавораў мы атрымаем пяцігадовы плян эўціхамірваньня Эўропы»,—заключае газэта.

ЛЁНДАН, 20-7. Афіцыйнае камунікэ, апублікаванае па сканчэньні паседжаньня канфэрэнцыі, гаворыць: «Макдональд вітаў дэлегатаў і ахарактарызаваў паходжаньне і прычыны крызысу, Лаваль даў справаздачу канфэрэнцыі аб парадках у Парыжы і ахарактарызаваў той дух, у якім былі пачаты перагаворы паміж французкімі і нямецкімі міністрамі. Вялікую ўвагу Лаваль аддаў падрабязнаму асьвятленьню пазыцыі Францыі ў сучасных перагаворах і выказаў надзею на лёяльнае супрацоўніцтва паміж Францыяй і Нямеччынай у мэтах аднаўленьня давер'я і крэдыту ва ўсім сьвеце. Брунінг выказаў падзяку за своячасовасьць перагавораў, якія адбыліся ў Парыжы, асьвятліў пры дапамозе статыстычных даных фінансавае становішча Нямеччыны, паведаміў аб мерапрыемствах, праведзеных для барацьбы з гэтым становішчам, і настойваў на неабходнасьці паклапаціцца аб фінансавай дапамозе Нямеччыне. Затым канфэрэнцыя абгаварыла пытаньне аб сваім прэзыдыуме і парашыла ад класьці працяг сваіх работ да заўтра. Плянарнае паседжаньне канфэрэнцыі назначана на заўтра, а 10 гадзіне раніцы, у міністэрстве замежных спраў».

На паседжаньні канфэрэнцыі Брунінг падкрэсьліў, што ў сувязі з фінансавым становішчам Нямеччыны побач з іншымі павінны быць у першую чаргу ажыцьцяўлены дзьве ўмовы: па-першае, павінна быць спынена ўцечка замежных крэдытаў з Нямеччыны і, падругое, павінна быць падвышана залатое забясьпечаньне грашовага звароту. Макдональд рэзюміраваў заяву Лаваля і Брунінга.

Пазьней ад імя нямецкіх дэлегатаў зазначалася, што перагаворы на канфэрэнцыі праводзіліся «у надзвычайна прымірэнчым духу».

Па сканчэньні першага паседжаньня канфэрэнцыі ўрадавых дэлегатаў Макдональд запрасіў нямецкіх міністраў неафіцыйна пабедаваць з ім у памяшканьні палаты абшчын. За абедам прысутнічалі апроч Макдональда і нямецкіх міністраў, Снаўдэн, Гендэрсон і таварыш міністра замежных спраў Вансінтэрд.

Лёйд Джордж заклікае ратаваць Нямеччыну ў імя адзінага антысавецкага фронту

ВЕНА, 20-VII. «Нэйэ Фрэйэ Прэсэ» публікуе артыкул Лёйд Джорджа пад назвай «небясьпека бальшавізацыі Нямеччыны». Лёйд Джордж рэзка крытыкуе пазицыю Францыі.

«Гэтак званыя «перагаворы»—піша Лёйд Джордж,—якія праводзяцца Францыяй у сувязі з плянам Гувэра, прадстаўляюць з сябе ня вельмі прыёмны малюнак для тых аптымістаў, якія яшчэ маюць здаровы сэнс і гуманасьць дзяржаўных дзеячоў». Аўтар папракае Францыю ў тым, што яна глядзіць на плян Гувэра выключна з пункту гледжаньня сваёй званіцы.

Плян Гувэра, паводле думкі Лёйд Джорджа, апраўдан ужо тым, што на працягу аднаго тыдню пасьля яго апублікаваньня «курс амэрыканскіх каштоўных папер падняўся». Асноўны аргумэнт у аказаньні дапамогі Нямеччыне Лёйд Джордж бачыць у набліжаючайся небясьпецы «камуністычнай рэвалюцыі. Калі Францыя адмовіць у дапамозе Нямеччыне, дык гэта прывядзе, паводле слоў Лёйд Джорджа, «да катастрафічнага саюзу» Савецкага Саюзу з будучай савецкай Нямеччынай, «Сьмелая прапанова прэзыдэнта,—піша Лёйд Джордж,—павінна выратаваць Нямеччыну і Аўстрыю ад унутранай пагібелі, ад нямінучасьці рэвалюцыі».

«Пастаянны рост камунізму ў Нямеччыне азначае цяжкую небясьпеку для ўсёй Эўропы. «Калі за фінансавым крахам Нямеччыны,—зазначае далей Лёйд Джордж,—прыдзе яшчэ зіма з цяжкім банкрутцвам і ростам беспрацоўя, дык краіна трапіць у рукі камуністаў, прычым Аўстрыя німінуча пасьледуе за Нямеччынай. Я не магу сабе ўявіць большай небясьпекі для Эўропы і для ўсяго сьвету, чымся камуністычная дзяржава ў Сярэдняй Эўропе, якой кіруе адзін з найбольш дысцыплінаваных і інтэлігентных народаў сьвету. Побач з камуністычнай Нямеччынай пад кіраўніцтвам нямецкіх кіраўнікоў у сто раз павялічыцца значэньне рускай рэвалюцыі. Расія мае навычарпальныя багацьці сыравінных запасаў і жыцьцяздольнасьці народных мас. Нямеччына мае дастатковы вопыт, здольнасьць і ўменьне скарыстаць гэтыя натуральныя багацьці Расіі.

«Вось чаму, — заканчвае Лёйд Джордж,—усе нацыі павінны прыняцьці неабмяжаваныяахвяры для папярэджаньня магчымасьці гэтага катастрафічнага саюзу».

Забастоўка тэлеграфістаў у Гішпаніі разрастаецца

ПАРЫЖ, 22-VII. Паводле паведамленьня агэнцтва Гавас з Гішпаніі, у Барсэлоне бомбай узорваны падземныя кабелі, з прычыны чаго перарваны ўсякія тэлеграфныя зносіны. У правінцыі Севілі мелі месца сутычкі паміж бастуючымі тэлефаністамі і паліцыяй. Забітых 4.

Гішпанскія „сацыялісты"-міністры ўводзяць фашысцкія мэтады барацьбы з бастуючымі

МАДРЫД, 22-VII. Міністр працы гішпанскага ўраду, лідэр сацыялістычнай партыі, Кавальера падаў сёньня на разгляд савету міністраў праэкт закону аб прымусовым арбітражы ў адносінах стачак.

Згодна гэтага закана-праэкту, будзе абвешчана незжоннай кожная забастоўка, калі канфлікт, на глебе якога яна ўзьнікла, не перададзены для вырашэньня ў парадку арбітражу. Савет міністраў абгаварваў сур'ёзнае становішча, стварыўшаеся ў Андалузіі, дзе ўсё пачайшаюцца сутычкі паміж сельска-гаспадарчымі рабочымі і паліцыяй. Пастаноўлена перавесьці ў распараджэньне муніцыпалітэтаў 10 мільёнаў пэзэт для барацьбы з беспрацоўем.

Беспрацоўе ў Англіі расьце

ЛЁНДАН, 22-VII. Лік зарэгістраваных беспрацоўных у Англіі складаў на 13-га ліпеня 2.642.589, г. зн. на 8.401 больш, чымся на мінулым тыдні, і на 702.823 больш, чымся год таму назад.

Масавая кампанія экзэкуцый у Заходняй Беларусі

Усе сэквэстратары выкліканы з водпускаў

ВІЛЬНЯ, 22-7. «Дзеньнік Віленскі» паведамляе ,што гэтымі днямі ў Вільні адбыўся надзвычайны зьезд фінансавых начальнікаў Віленскага, Навагрудзкага і Палескага ваяводзтваў. Гэты надзвычайны зьезд праходзіў пад кіраўніцтвам спэцыяльнага прадстаўніка міністэрства фінансаў.

Зьезд, абгаварыўшы становішча, якое склалася ў выніку вялікай запазычанасьці па падатках, пастанавіў прыняць самыя суровыя меры ў спагнаньні падаткаў. Згодна пастановы зьезду, усе сэквэстратары (падатковыя чыноўнікі), якія знаходзяцца зараз у адпачынку, выклікаюцца на месца выкананьня сваіх службовых абавязкаў.

У выкананьне пастаноў гэтага надзвычайнага зьезду шырокія бядняцка-сераднякіцкія масы, якія маюць вялікія заазычанасьці па падатках, будуць падлягаюць самым жорстким рэпрэсіям.

У некаторых вёсках Віленшчыны сэквэстратары з аддзелаў паліцыі ўжо пачалі сваю працу. За падаткі згодна сэкрэтным інструкцыям гэтыя экспэдыцыі прадаюць з-пад малатка за бяцэнак усю маемасьць сялян.

Вялікая навальніца ў Віленскім і Навагрудзкім ваяводзтвах

ВІЛЬНЯ, 22-7. Як паведамляе «Дзеньнік Віленскі», 21-га ліпеня па Віленскім і Навагрудзкім ваяводзтве прайшла з надзвычайна вялікай сілай навальніца з градабіцьцем. Навальніца зрабіла вельмі вялікія шкоды. У шмат якіх вёсках ад маланкі здарылася мно га пажараў. Дакладная колькасьць страт невядома. Паводле няпоўных пад лікаў, у адным толькі Навагрудзкім ваяводзтве зьнішчана 4 тыс. га пасеваў.

Гэта вялізарнейшая па сваіх разьмерах навальніца, якая нанесла вялікія страты тысячам бядняцка-сераднякіцкіх гаспадарак, зруйнавала ў некаторых вёсках пагалоўна ўсе засевы, выклікае масавы голад у Заходняй Беларусі. Фашысцкі ўрад, які крывавы пот працоўных пераковывае на гарматы і штыкі супроць СССР, бязумоўна, ня дасьць ні гроша пацярпеўшым ад навальніцы.

Рабочыя шоўкаапрацоўчай прамысловасьці ПАЗШ рых туюцца да забастоўкі

НЬЮ-ЁРК, 20-VII. У Патэрсоне адбылася канфэрэнцыя дэлегатаў ад рабочых шоўкаапрацоўчай прамысловасьці. Канфэрэнцыя арганізавана рэвалюцыйным прафсаюзам тэкстыльшчыкаў. У канфэрэнцыі ўдзельнічала 89 дэлегатаў, прадстаўляўшых 47.000 рабочых важнейшых цэнтраў шоўкаапрацоўчай прамысловасьці.

Забастоўка гарнякоў працягваецца

НЬЮ-ЁРК, 20-VII. «Нью-ЁРК Таймс» паведамляе, што ў Канаксбурзе (штат Пэнсільваніі) бастуючыя гарнякі разагналі мітынг, арганізаваны рэфармісцкім прафсаюзам у мэтах зрыву забастоўкі.

У часе сутычкі паранена больш 100 чалавек, сярод іх кіраўнік пісцбурскага акруговага аддзяленьня рэфармісцкага прафсаюзу.

„Чырвоная небясьпека ў Кітаі становіцца ўсё больш пагражаючай"

Прызнаньне ворага

ШАНХАЙ, 20-VII. Газэты публікуюць рад артыкулаў сакратара нацыянальнага дасьледчага інстытуту Ян Чжэна, які малюе малюнак разьвіцьця камуністычнага руху ў Кітаі.

Аўтар зазначае на паражэньні, нанесеныя нанкінскім урадам і яго арміямі ў барацьбе з камунізмам і на іх спробы затаіць свае няўдачы. Аўтар падкрэсьлівае неабходнасьць скінуць з сябе апатыю і зразумець сур'ёзнасьць камуністычнай пагрозы.

— Тое, што 3 гады назад было нікчэмным жартам—піша Ян Чжэн,—зараз вырасла ў вялізарнейшую грозную арганізацыю, якая патрабуе 30 дывізій для свайго прыдушэньня.

СУСТРЭЦЬ ХЛЕБ

У ПОЎНАЙ БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЬЦІ

Збожжазагатоўчыя арганізацыі Віцебшчыны ня маюць плянаў, тары і складаў не хапае, транспарт не падрыхтаваны. Забясьпечыць своечасовае і поўнае выкананьне плянаў збожжазагатовак

Віцебшчына не разгарнула падрыхтоўкі да збожжазагатовак

Набліжаецца збожжазагатоўчая кампанія. Яна вымагае ад усіх каапэрацыйных і збожжазагатоўчых арганізацый своечасовай распрацоўкі падрабязных плянаў абсталяваньня складачных памяшканьняў, падрыхтоўкі тары і г. д. Але на справе мы бачым з боку гэтых арганізацый поўную недацэнку ўсёй палітычнай важнасьці гэтай кампаніі.

На сёньняшні дзень ні ў аднэй загатоўчай арганізацыі Віцебскага раёну, пачынаючы з кіруючых і канчаючы нізавымі арганізацыямі, няма пляну правядзеньня збожжазагатовак. Яшчэ дасюль ня ведаюць, хто будзе сёлета праводзіць збожжазагатоўкі. У выніку гэтага на мясцох ніякай работы ў гэтым напрамку не праводзіцца. Усё чакаюць паказаньняў ад цэнтральных арганізацый.

Становішча складачных памяшканьняў як па горадзе так і ў раёне вельмі трывожнае. Толькі нядаўна Саюзхлеб пачаў аслабяць складачныя памяшканьні, якія пасьля іх аслабаненьня трэба адрамантаваць і прадэзынфэктаваць. Апрача гэтага, плошчы пад складамі ня хопіць на 1.000 тон збожжа. У гэтым напрамку Саюз хлебам амаль нічога ня зроблена.

Яшчэ больш пагражаючае становішча з падрыхтоўкай тары. На сёньняшні дзень у Віцебскай рамонтнай базе Саюзтары ёсьць адрамантаваных 8200 мяхоў, а між тым для правядзеньня збожжазагатоўчай кампаніі іх патрэбна каля 60.000

Вакол месячніку збору тары, які праводзіцца зараз, адпаведныя арганізацыі ня склалі грамадзкай думкі і рад арганізацый дагэтуль зусім ня прыступілі да яго правядзеньня, напрыклад, ЖАКТ № 4 ня здаў яшчэ ніводнага мяшка. У выніку гэтага з агульнага заданьня ў 1.000 мяшкоў па горадзе сабрана толькі 240, а ад сельсаветаў раёну нават і вестак ніякіх няма.

З боку гандлёвых арганізацый гораду мы маем на сёньняшні дзень вялікую запазычанасьць мяшкоў Віцебскай базе Саюзтары, што сьведчыць пра зусім нядбайныя адносіны гэтых арганізацый да хаваньня тары і пра поўнае неразуменьне або нежаданьне выконваць пастановы партыі і ўраду ў гэтым напрамку. Так, па Віцебскім ЦРК лічыцца нязданымі 46.633 мяшкі на суму 129.210 руб. 75 кап., за транспартным спажыўтаварыствам — 8.145 мяшкоў на 22.398 руб. 75 кап., за Віцебскім райспажыўтаварыствам—9.658 на суму 26.599 руб. 50 кап. і г. д.,

Ня лепшае становішча мы назіраем у адносінах падрыхтоўкі да хлебазагатоўчай кампаніі транспарту. У гэтым напрамку ніводнай загатоўчай арганізацыяй нічога не прароблена, у той час калі па цэлым радзе раёнаў яны павінны будуць карыстацца выключна гужавым транспартам.

Ня гледзячы на тое, што ў параўнаньні з мінулым годам сёлетняя збожжазагатоўчая кампанія павінна будзе праходзіць у зусім іншых абставінах, ніводная збожжазагатоўчая арганізацыя вакол гэтай кампаніі яшчэ не мабілізавала ўвагі калгасных і бядняцка-сераднякіцкіх мас аднаасобнікаў.

Такія трывожныя сыгналы з фронту хлебазагатоўчай кампаніі павінны зараз-жа прымусіць усе хлебазагатоўчыя арганізацыі бездакладна разгарнуць шырокую растлумачальную і наогул падрыхтоўчую работу да правядзеньня гэтай кампаніі, зьнішчыўшы апартуністычныя адносіны, якія назіраюцца яшчэ і да гэтага часу, каб сустрэць хлеб у поўнай баявой гатоўнасьці.

Ваўдай.

Склады не адрамантаваны, тары няма

Кампанія па падрыхтоўцы да хлебазагатоўчай кампаніі і па зборы тары па Клімавіцкім раёне зрываецца. Не зважаючы на тое, што дырэктывы РВК дадзены, яны ня выконваюцца. Райсаюз і райкаапсаюз спрачаюцца паміж сабою аб тым, хто будзе загатаўляць збожжа, а памяшканьні пад склады да гэтага часу не адрамантаваны.

Тая непматлжая тара, якая ёсьць на складах райсаюза і райкаапсаюза, знаходзіцца ў дрэнным становішчы, яна патрабуе рамонту, за які ніхто яшчэ не ўзяўся. Райсаюз суцяшае сябе тым, што «часу яшчэ шмат, пасьпеем».

Збор тары па раёне зусім правален, бо нідзе ніжай растлумачальнай работы ў гэтым напрамку не праводзілася.

Трэба неадкладна ўзяцца за падрыхтоўку да хлебазагатовак, бо ўборачная кампанія ўжо разгортваецца і неўзабаве трэба будзе пачынаць прыём збожжа. Непадрыхтаванасьць-жа да гэтай работы можа сарваць усю хлебазагатоўчую кампанію па раёне.

Б.

Напярэдадні

БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК—

калектыўны прапагандыст і арганізатар мас на барацьбу за сацыялізм

Буржуазная і сацыял-фашысцкая прэса—зброя контр-рэвалюцыі

З дакладу тав. БУДЗІНСКАГА на 2-м усебеларускім зьезьдзе рабсельваенкораў

Таварышы! Наш друк неадлучны ад нашай партыі. Пачынаючы з падполь нага перыяду, наш друк быў найбольш дзейным сродкам узьдзеяньня камуністычнай партыі на масы, зброяй прапаганды камуністычных ідэй, зброяй арганізацыі мас. Наш друк ні колі не разглядаўся нашай партыяй выключна, як зброя прапаганды. Заўсёды бальшавікі разглядалі друк, падкрэсьліваю, сьвядома разглядалі друк, як фактар, які арганізуе масы, як тую частку партыйнага ўзброеньня, якая дапамагае партыі згуртоўваць масы, прыводзіць іх у мэтазгодныя формы арганізацыі для барацьбы.

1. За ленінскае разуменьне ролі бальшавіцкага друку

У падыходзе да пытаньняў друку бальшавікі адрозьніваліся ад іншых рэвалюцыйных сацыял - дэмакратаў (напрыклад, СД КПЛ) тым, што ў той час, калі рэвалюцыйныя сацыял-дэмакраты недаацэньвалі або не заўважвалі значэньня друку, як арганізуючага фактара, разглядалі друк выключна, як зброю прапаганды, як зброю агітацыі, бальшавікі з першага моманту свайго існаваньня клалі на ціск у роўнай ступені і на арганізатарскую ролю друку. Ленін у 1901 г. у артыкуле «С чего начать»? такім чынам акрэсьліваў ролю і характар нашага партыйнага друку:

«Роля газэты не абмяжоўваецца, аднак, адным распаўсюджаньнем ідэй, адным палітычным выхаваньнем і прыцягненьнем палітычных саюзьнікаў. Газэта—ня толькі калектыўны прапагандыст і калектыўны агітатар, але таксама і калектыўны арганізатар... Пры дапамозе газэты і ў сувязі з ёю сама сабой будзе складвацца пастаянная арганізацыя... Адна ўжо тэхнічная задача—наладзіць правільнае забесьпячэньне газэты матар'ялямі і правільнае распаўсюджаньне яе — пры мушае стварыць сетку мясцовых агентаў адзінай партыі, агентаў, якія знаходзяцца ў жывых зносінах адзін з другім, ведаюць агульнае палажэньне спраў, прывыкаюць рэгулярна выконваць раздробленыя функцыі агульна-рускай работы, прабуюць свае сілы на арганізацыі тых ці іншых рэвалюцыйных дзеяньняў» (том IV, стар. 35-39).

Гэта акрэсьленьне характару нашага друку, данае Леніным, ня страціла свайга значэньня і сёньня. Апартуністам зьяўляецца той, хто лічыць, што работнік друку—я гэта разуменьне ўжываю ў самым шырокім значэньні гэтага слова, значыцца, гавару ня толькі аб прафесыянальных работніках друку, але аб усёй рабселькораўскай масе,—што работнікі друку выключна агітатары, выключна прапагандысты, выключна сыгналізатары або выключна крытыкі і выкрывальнікі. На гэтым пункце гледжаньня стаяць правыя апартуністы, на чале якіх стаяў ў свой час і тав. Бухарын. Відома, гэта ацэнка ролі друку і работнікаў друку нічога супольнага ня мае з сапраўднасьцю і з установукамі нашай партыі.

Ленін у артыкуле «Письмо к товарищу о газете «Вперед» наступным чынам вызначае мэтады стварэньня пралетарскага друку:

«Гэта недарэчнасьць, быццам-бы іменна літаратары і толькі літаратары (у прафесыянальным сэнсе гэтага слова) здольны з посьпехам прымаць удзел у органе; наадварот, орган будзе жывым і жыцьцёвым толькі тады, калі на пяць кіруючых і пастаянна пішучых літаратараў прыпадзе пяцьсот і пяць тысяч работнікаў нелітаратараў» (том V, стар. 506).

У гэтай фармулёўцы Леніна завершана ўся праграма разгортваньня рабселькораўскага руху, як асноўнай рэзэрвовай сілы нашага бальшавіцкага друку.

Наш бальшавіцкі друк заўсёды быў друкам рабочае клясы і для рабочае клясы. У стары час, у час нашага падполья, ды і зараз яшчэ ў краінах капіталу ёсьць надзвычай многа друкаваных арганаў буржуазіі і дробнай буржуазіі, якія прызначаны для рабочае клясы, якія падпрабляюцца пад мову рабочае клясы, прабуюць стварыць уражаньне, што яны стаяць на абароне рабочае клясы. Аднак, гэтыя органы друку, як-бы яны шумна не называліся ці то **«Прыяцель народу»**, ці то **«Работнік»**, ці то **«Гонец воли»** —усе служаць адной мэце: яны імкнуцца параліжаваць барацьбу рабочае клясы, адцягнуць яе ад рэвалюцыйных дзеяньняў, зрабіць яе такім чынам навольнікам капіталу. Гэты друк «для рабочага», зьяўляецца друкам найбольш варожым рабочай клясе, бо ён на справе служыць інтарэсам, варожым рабочай клясе.

Бальшавікі, ня ў прыклад меншавікам, ня ў прыклад згодніцкім партыям, заўсёды лічылі, што друк павінен быць партыйным, клясавым. Таму наш друк заўсёды быў друкам ня толькі для рабочае клясы, але і друкам, які стараўся рабочай клясай. Бальшавікі патрабавалі, каб кожны орган друку меў выразна акрэсьленыя задачы, выразна акрэсьленыя мэты, мэтады сваёй работы і палітычную лінію. Яны самым рашучым чынам змагаліся за раскрыцьцё істотнага твару органаў друку, за выкрыцьцё клясавай сутнасьці тых органаў друку, якія сваю варожасьць да рабочай клясы ўтойлівалі пад маскай паза клясавасьці, надпартыйнасьці, аб'ектывізму.

2. Твар буржуазнай „свабоды слова"

Свабода слова. Неабходна крыху спыніцца на нашым рабселькораўскім зьезьдзе на гэтай «свабодзе слова». Свабоду слова кожны па-свойму разумее. Усё залежыць ад таго, да якой клясы прыналежыць той, хто гаворыць аб свабодзе слова, у залежнасьці ад таго, інтарэсам якой клясы павінна служыць гэта свабода слова. Для фашыста свабода слова азначае разлажэньне рабочае клясы буржуазнай хлусьнёю аб нацыянальным адзінстве, аб клясавай салідарнасьці або аб зьверстах бальшавікоў. Фашыст спакойна закрывае ўдарам гумовай палкі рот камуністу за тое, што гэты апошні выкрывае фашысцкае прыгнечаньне і капіталістычную эксплёатацыю. Вазьмеце нашых унутраных ворагаў. Для многіх з вас прозьвішча літаратурнага крытыка Ляжнёва ня чужое. Дык вось гэты літаратурны крытык, якога можна было чытаць у нашых тоўстых часопісях, неяк выказаў наступную думку: **«Дайце нам—г. зн. буржуазнай зьменавехаўскай інтэлігенцыі, свабодна выказвацца ў савецкай прэсе ў сэнсе стылю і зьместу».** З першага погляду здаецца патрабаваньне вельмі скромнае: «свабодна выказвацца ў сэнсе стылю». Але мы дасканала ведаем, што ўсякія стылістычныя выкрутасы служаць толькі для таго, каб утаіць сапраўдную думку, каб мець магчымасьць прапагандаваць «иносказательно» контр - рэвалюцыйныя ідэі, каб пры дапамозе прыгожасьцяй стылю пашырыць палітычную атруту.

Ясна, што пралетарыят, які будуе ў найцяжэйшых умовах сацыялізм, не рамагае непамерныя труднасьці, створаныя супраціўленьнем клясавага ворага ня можа згадзіцца на прадастаўленьне такой свабоды слова, свабоды контррэвалюцыйнай прапаганды і размагнэсаваньня волі працоўных мас, бо гэта прапаганда зьяўляецца падрывам нашых сіл, падрывам веры ў нашы сілы і толькі самагубцы, а не змагары за справу пралетарыяту або здраднікі маглі-б ісьці на прадастаўленьне клясаваму ворагу такой свабоды слова.

А ў нашай партыі былі такія людзі, калі мы пераходзілі ад палітыкі ваеннага комунізму на рэйкі новай эканамічнай палітыкі, пасобныя члены нашай партыі лічылі, што гэта паварот да капіталізму. Яны патрабавалі ў выніку, каб партыя зрабіла з гэтага павароту нібыта да капіталізму ўсе неабходныя вывады. Гэтыя людзі разважалі прыкладна так: раз партыя паварочвае назад да капіталізму, дык не абходна вярнуцца і да буржуазнай свабоды слова. Нейкі Мясьнікоў, у той час даволі выдатны член партыі, патрабаваў свабоды слова для ўсіх, у тым ліку і для ворагаў рабочае клясы—свабоды слова ад манархістаў да анархістаў. Ён у гэтым бачыў магчымасьць шырокага разгортваньня таго, што мы называем самакрытыкай. Вы можаце сабе ўявіць, пры выкананьні мясьнікоўскага лёзунгу аб свабодзе слова ад манархістаў да анархістаў, якую «самакрытыку» закаціў бы нам манархіст генэрал Куцепаў. Гэта генэральска - манархістычная «самакрытыка» была-б удушлівай хмарай паклёпаў, якая прыкрывала-б арганізацыю контр-рэвалюцыйных сіл, што рыхтуюцца граміць пралетарскую рэвалюцыю. Свабода слова для манархістаў азначае свабоду мабілізацыі і арганізацыі контр-рэволюцыйных белагвардзейскіх сіл, і органы гэтай «свабоды слова» былі-б зьвязаючым і арганізуючым цэнтрам расійскай контр-рэвалюцыі. Гэта факт, і гэты факт у нас зразумелы ня толькі пімэрам, але і акцябратам. Ён ня быў зразумелы толькі правым апартуністам або «левакам», тыпу Мясьнікова. Калі буржуазіі не ўдаецца разьбіць пралетарыят у адкрытым баі, дык яна са здавальненьнем згодзіцца на тое, каб разграміць яго абыходным параднам, скарыстоўваючы адсутнасьць шільнасьці або даверлівасьць рабочае клясы або яе памылковыя крокі.

Што значыць анархія, якая прапаведуецца анархістамі? Гэта зьнішчэньне ўсякай дзяржаўнай улады, улады, заснаванай на прымусе, значыць, зьнішчэньне і дыктатуры пралетарыяту, бо дыктатура пралетарыяту гэта — канцэнтраваная і ўзброеная ўлада рабочае клясы. Што прапаведуюць анархісты? Яны прапаведуюць зьнішчэньне дыктатуры пралетарыяту сёньня, калі клясы яшчэ не ліквідаваны, калі клясавая барацьба працягваецца. Яны патрабуюць, каб рабочыя масы і бядняцка-серадняцкае сялянства, якое ідзе ў саюзе і пад кіраўніцтвам пралетарыяту разбурылася, распусьцілі наш дзяржаўны пралетарскі апарат і яго ўзброены орган ДПУ і Чырвоную армію, каб мы распусьцілі наш савецкі, прафсаюзны і партыйны апарат. Кожны з вас разумее, што рабочая кляса, прарабіўшы такую апэрацыю, стала-б перад сваім непаматлікім, але дасканала ўзброеным і арганізаваным клясавым ворагам бездапаможнай і слабой. Бо эксплёататары не пасьледавалі-б добраахвотна нашаму прыкладу. Наадварот, капіталістычныя ваўкі, бачачы, што пралетарыят і працоўныя масы перасталі быць узброенымі да зубоў змагарамі, здольнымі біцца не на жыцьцё, а на сьмерць за справу рабочае клясы, што працоўныя масы сталі пазбаўленымі зброі абароны—авечкамі,—схапілі-б нас за горла, каб зьнішчыць і падначаліць сабе. Кожны з вас дасканала ведае, што, калі на вуліцах Варшавы або Бэрліну выступаюць неарганізаваныя натоўпы рабочых па некалькі тысяч чалавек, калі гэтыя натоўпы ня кіруюцца моцнай партыйнай баявой арганізацыяй, калі яны ня маюць зброі ў руках, дык для разгону гэтых дэманстрацый, для падначаленьня мас эксплёататарам, даволі групы паліцэйскіх на матацыклях, атраду конной паліцыі, пажарнай кішкі, і гэты натоўп разганяецца і падначальваецца загадам капіталу. Мы бачым, як група паліцэйскіх з некалькіх дзесяткаў або соцень чалавек трымае ў падначаленьні сотні і сотні тысяч чалавек. Узброены да зубоў і дасканала арганізаваны пласт эксплёататараў, хаця-б параўнаўча ня вельмі шматлікі, можа, дзякуючы зброі і арганізацыі, прымусіць падпарадкавацца мільённыя масы рабочае клясы і працаўных.

Ці можам мы даць свабоду слова людзям, якія прыходзяць да рабочай клясы і прапануюць ёй перад трыбунам клясавага ворага разброіцца, заяўляючы, што толькі такім чынам мы дабіўемся сапраўднай свабоды? Відома — не, бо анархісцкая прапаганда зьяўляецца такой-жа скрытай формай дапамогі клясаваму ворагу, як і работа сацыял-фашыстаў, і па сутнасьці анархісцкая прапаганда служыць пасвойму справе тае-ж клясы, што і прапаганда манархістаў. Для рабочае клясы інтэрэсы ідэалёгія манархістаў і ідэалёгія анархістаў зьяўляюцца двума бакамі адной і тэй-жа мэдалі — панаваньня капіталістычнай эксплёатацыі.

Чым зьяўляецца ў сапраўднасьці буржуазная свабода слова?

На гэта пытаньне мы знойдзем вельмі лоўны і вычарпальны адказ у **Леніна.** Гэтыя словы Леніна нам, рабкорам, калгаскорам, ваенкорам і селькорам трэба добра запамятаць, бо ня раз больш адсталыя рабочыя альбо сялянскія масы высоўваюць перад намі гэтыя пытаньні.

Вось, як Ленін характарызаваў буржуазную свабоду друку:

«Паны буржуазныя індывідуалісты, мы павінны сказаць вам, што вашы прамовы аб абсалютнай свабодзе адна крывадушнасьць. У грамадзтве, аснованым на ўладзе грошай, у грамадзтве, дзе масы працоўных цярпяць нэндзу і жменька багатароў туняядніча, ня можа быць «свабоды» рэальнай і сапраўднай. Ці вольны вы ад вашага буржуазнага выдаўцы, пан пісьменьнік? Ад вашай буржуазнай публікі, якая патрабуе ад вас парнаграфіі ў рамках і малюнках, прастытуцыі ў выглядзе «дадатку» да «сьвятога» сцэнічнага мастацтва? Але-ж гэта абсалютная свабода ёсьць буржуазная ці анархічная фраза (бо, як сьветапогляд, анархізм ёсьць перавернутая на другі бок буржуазнасьць). Жыць у грамадзтве і быць свабодным ад грамадзтва нельга. Свабода буржуазнага пісьменьніка, мастака, актрысы ёсьць толькі замаскаваная (ці крывадушна замаскаваная) залежнасьць ад грашовага мяшка, ад подкупу, ад утрыманьня» (Ленін, том VII, ч. 1-я, стар. 25).

Гэтыя фармулёўкі Леніна, выказаныя ў 1905 г., знайшлі яшчэ больш яскравае выражэньне ў 1921 г. у тэзісах Леніна аб буржуазнай дэмакратыі і дыктатуры пралетарыяту. З вялізарным сарказмам Ленін зрывае ў сваіх тэзісах маску з буржуазнай свабоды друку:

... «Свабода друку» таксама служыць адным з галоўных лёзунгаў чыстай дэмакратыі». Тым ня менш рабочыя ведаюць, а сацыялісты ўсіх краін прызнавалі гэта мільёны разоў, што гэта свабода — зман да таго часу, пакуль лепшыя друкарні і самыя вялікія запасы паперы будуць знаходзіцца ў руках капіталістаў, а ўлада капіталу будзе працягваць папаваць над прэсай, тая ўлада, якая праяўляецца ва ўсім сьвеце, тым ясьней, рэзчай і цынічней чым больш разьвітымі аказваюцца дэмакратызм і рэспубліканскі рэжым, як, напрыклад, у Амэрыцы» (Ленін, том XVI, стар. 39-40).

Таварышы, гэту свабоду друку пабуржуазнаму лепш за ўсё адчуваюць нашы замежныя таварышы. Я ўжо не гавару аб існаваньні цэнзуры. Я не гавару аб тым, што вельмі часта тыя ледвыя газэты, якія яшчэ не задушаны буржуазіяй, выходзяць скрозь белымі палосамі з адным толькі надпісам: «канфіскавана». Бывае і так, што калі прыходзяць нашы таварышы радыкальныя сялянскія дзеячы ці прыхільнікі барацьбы за дыктатуру пралетарыяту, што ідуць пад сьцягам лявіцы ППСу Польшчы, з газэтным матар'ялам, праверанным цэнзураю ў друкарню, дык аказваецца, што друкавацьнельга: паліцыя забараніла ўласьніку друкарні прыняць заказ радыкальных левых рабоча-сялянскіх дзеячоў. Наогул, калі ёсьць хоць нязначныя падазрэньні, што асобы, якія зварочваюцца ў друкарню, зьяўляюцца прадстаўнікамі прамадзянскай левай, іх заказаў ня прымаюць, ня друкуюць, ня гледзячы на беспрацоўе і крызіс.

Такую-ж барацьбу вядуць камуністычныя газэты ў краінах, дзе кампартыі існуюць нібы легальна, напрыклад ва Францыі, газэта «Юманітэ» у Нямецкіне «Ротэ Фане» і іншыя.

Гэтыя газэты існуюць выключна, дзякуючы вялізарнымахвярам рабочай клясы, якая, пакутуючы ад холаду, голаду і беспрацоўя, ахвяруе апошнія для падтрыманьня свайго баявога органу друку. Наш камуністычны друк заграніцай павінен весьці барацьбу ня толькі супроць цэнзуры, але і супраць магутных буржуазных канцэрнаў, якія кідаюць у рабочыя прадмесьці мільённыя экзэмпляры жоўтага друку пад самымі «чырвонымі» загалоўкамі і за самую танную плату.

Буржуазія можа скарыстоўваць самыя апошнія тэхнічныя вынаходзтвы, усе перавагі капіталістычнай тэхнікі, каб прыцягнуць чытача крыклівасьцю сэнсацыйнасьцю, зьнешнім цікавым і рознакаляровым выглядам за мінімальную, напалову, а то і больш нізкую, чым камуністычны друк, цану. Атрым ліваецца так, што на вуліцу Парыжу выходзіць мала сьвядомы рабочы, яко му сунуць у руки надрукаваны чырвонай фарбай нумар газэты парфумэрнага караля Коці, над назвай «Прыяцель народу» за цану ў дзесяць сантымаў, у той час, калі ўсе другія газэты могуць прадавацца ледзь па 20 сантымаў. Маласьвядомы рабочы захапляецца «левым» загалоўкам, надрукаваным чырвонай фарбай, захапляецца таннасьцю і пры дапамозе цэлага роду сенсацыйных выдумак і ілжы, адцягваецца ад клясавай барацьбы за зьнішчэньне капіталізму і пабудову сацыялізму.

Буржуазны друк добра служыць сваёй клясе і мы невыпадкова, экс-а прыючы экспрапрыятараў, у 1917 г скасавалі права на існаваньне буржуазнага друку. Гэты друк, як казаў т. Ленін пасьля кастрычніка 1917 г., быў бомбай ілжы, дапаўняючай бомбы Каледзіна: «Мы ня можам,—казаў т. Ленін, да бомб Каледзіна дадаваць бомбы ілжы. Мы ня можам дапусьціць, каб на франтох грамадзянскай вайны памірала лепшая частка рабочай клясы ад зброі, і каб унутры краіны атручвалі рабочую клясу ілжой буржуазнага друку».

Паглядзеце, таварышы, на твар буржуазнага друку. Разглядзеце ў чым сутнасьць гэтай бомбы ілжы?

Для прыкладу возьмем адно пытаньне. Спадзяюся, таварышы, што вы ўсе пагалоўна чыталі апошнюю прамову тав. Сталіна да гаспадарнікаў. Я глыбока ўпэўнены, што вы ўсю гэту прамову моцна запомнілі, гэта-ж вялізарная значэньня гістарычны дакумант. Невыпадкова, увесь наш друк і друк Савецкага Саюзу і камуністычны друк усяго сьвету прысьвяцілі гэтай прамове ня толькі ўступныя артыкулы, але заняліся глыбокай прапрацоўкай гэтай прамовы, і ўсю сваю працу перабудавалі згодна з заданьнямі, якія высунуў тав. Сталін у гэтай прамове.

Буржуазны друк ставіць ва ўзаемную прычынную сувязь прамову тав. Сталіна і апошні дэкрэт ЦВК, у якім гаворыцца, што калі раскулачаны кулак на працягу пяці год на месцы сваёй ссылкі вядзе сябе сумленна, дык ён можа быць адноўлен у правох грамадзянства. На гэтай падставе буржуазны друк на Захадзе трубіць у трубы аб адступленьні савецкай улады, аб «новым курсе саветаў», аб пераходзе «ад мэтадаў ваеннага камунізму да мэтадаў капіталістычнага буржуазнага кіраўніцтва». Для нас з вамі тут, у БССР, наогул у Савецкім Саюзе, гэтыя заявы буржуазнага друку выклікаюць гіранічныя адносіны. Але там, на Захадзе, гэтыя дзікія выдумкі і нахабная фальшь разьлічаны на тое, каб падарваць веру рабочых мас у наша будаўніцтва, каб параліжаваць іх волю да барацьбы за зьнішчэньне капіталістычнага парадку і ўстанаўленьне дыктатуры пралетарыяту.

Вось што, літаральна, піша «Кур'ер Віленскі»:

«Новы курс адзначае ў першую чаргу некаторае прымірэньне са старай прафесыянальнай інтэлігенцыяй, уцягненьне ў работу некаторых беспартыйных колаў, а таксама некаторае зьмякчэньне мэтадаў, якія ўжываліся дагэтуль у адносінах да так званых кулакаў».

Адкуль орган віленскіх пілсудчыкаў фашыстаў у лібэральнай вопратцы, узяў, што наша партыя лічыць неабходным прымірыцца са старай прафесыянальнай інтэлігенцыяй? Мы заўсёды сталі на пункце гледжаньня неабходнасьці выкарыстаць старую прафесыянальную інтэлігенцыю, мы заўсёды змагаліся ў нездаровым зьявішчам спэцаедзтва, але мы заўсёды моцна білі і будзем біць па тэй частцы старой прафесыянальнай інтэлігенцыі, якая прабуе весьці барацьбу супроць дыктатуры пралетарыяту, за аднаўленьне ўлады буржуазіі. Контр-рэвалюцыйныя ўчынкі і шкодніцкая дзейнасьць некаторай часткі старой прафесыянальнай інтэлігенцыі выклікала ў рабочай клясе зусім законную рэакцыю недавер'я да гэтай інтэлігенцыі, і тав. Сталін зусім правільна папярэджваў рабочыя масы і партыйцаў супроць шкодных абатуленьняў і перагібаў у гэтай галіне, падкрэсьліваючы той пералом на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва, які меў месца ў сувязі з посьпехамі нашага будаўніцтва, з аднаго боку, і з разгромам шкодніцкіх арганізацый. Зразумела, толькі буржуазныя банкруты бачачы наблізкэньне свайго краху, могуць «обольщаться надеждой», што мы ідзем на прымірэньне наогул са старай прафесыянальнай інтэлігенцыяй, што мы бяз гэтай інтэлігенцыі ня можам працягваць будаваць нашу гаспадарку.

Яшчэ сьмяшней гучаць словы фашысцкага органу аб уцягненьні ў работу некаторых беспартыйных колаў. У тав. Сталіна гаворыцца аб тым, каб цярпі уцягваць у работу і высоўваць на камандныя пасты беспартыйных рабочых. Вось гэта месца яны, «карыстаючыся спрытнасьцю рук, перакладаюць, як прымірэньне, прыцягваньне да работы некаторых беспартыйных колаў. Аказваецца, аб чым мы з вамі ня ведалі, да гэтага часу партыя наша не апіралася на беспартыйных рабочых, як гэта было ў сапраўднасьці, але знаходзілася ў стане вайны, і што толькі цяпер, калі па ўпэўненьнях фашысцкага друку, якім і ён сам ня верыць, наша сацыялістычнае будаўніцтва пашырэла крах, мы для выратаваньня гаспадарчага будаўніцтва пасталі прымірыцца з беспартыйнымі рабочымі. Трэба думаць, таварышы, што яны будуць мець магчымасьць, калі папрабуюць «прощупать», штыхом нашу сілу і зьнітаванасьць, яны пераканаюцца, што ня варта гаварыць аб нашай размычцы з беспартыйным, калі беспартыйныя рабочы, беднякі і сераднякі сяляне, пад кіраўніцтвам нашай партыі, узброеныя, новай тэхнікай Чырвонай армі саданулі заходніх імпэрыялістаў так, што ім цёмна ў вачох зробіцца (аплёдысмэнты).

Яны ў прамове т. Сталіна і ў дэкрэце ЦВК СССР аб кулаках выкладалі вымякчэньне мэтадаў, якія ўжывалися дагэтуль у адносінах да так званых кулакаў».

Гэта ўтлумачэньне нашых дэкрэтаў і ўстановак мы адказваем што дзённым узмацненьнем тэмпаў калектывізацыі, пераходам усё новых і новых раёнаў у разрад раёнаў суцэльнай калектывізацыі дзе кулацтва ліквідуецца як кляса, дзе яно раскулачваецца і высяляецца за межы раёну суцэльнай калектывізацыі. Гэты адказ, які мы даем штодня, зьяўляецца лепшым адказам на ілжывыя выдумкі буржуазнага друку.

Але буржуазны друк у далейшым знайшоў у прамове тав. Сталіна яшчэ больш сенсацыйныя рэчы, якіх мы з вамі ня бачылі, ня гледзячы на тое, што мы гэту прамову ўважліва вывучылі і прапрацавалі.

У лейб-органе польскага фашызму «Газэце Польскай» аб прамове тав. Сталіна гаворыцца наступнае: **«Сталін заявіў, што неабходна спаліць камуністычныя сьвятасьці, якія да гэтага часу яшчэ існуюць, і вярнуцца да таго, што раней асуджалася... Сталін заявіў, што неабходна вярнуцца да капіталістычнай сыстэмы ўзнагароды за бочых... Ён заявіў аб неабходнасьці самай жорсткай дысцыпліны ў прадпрыемствах, кажучы, што будуць зьвяшчаны так званыя фабрычна-заводзкія камітэты і ўведзена аднасабовае кіраўніцтва фабрыкамі з боку дырэктароў».**

Тут што ні слова, то хлусьня перамнажаецца на бязглузьдзіцу. Фашысцкі орган прабуе зрабіць від, што зьдзельная заработная плата, прэміяльная сыстэма аплаты, а таксама аплата працы па ня якасьці і кваліфікацыі зьяўляюцца адзнакамі «капіталістычнай сыстэмы ўзнагароды за працу». Гэта дзікая бязглузьдзіца.

У сацыялістычным грамадзтве, пабудаваным не на прынцыпе камуністычнага грамадзтва—«кожнаму па патрэбнасьцях і кожнаму па матчымасьці», ужываецца прынцып—кожнаму па заслугах. Гэта было ўстаноўлена задоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў працах Маркса, Энгельса і іншых асноваталожнікаў рэвалюцыйнага сацыялізму. Што-ж датычыць жорсткай працоўнай дысцыпліны, дык гэта зьяўляецца адной з праграмных установак партыі рабочае клясы. Адносна зьнішчэньня фабрычна-заводзкіх камітэтаў і ўведзеньня аднасабовага кіраўніцтва прадпрыемствамі паны фашысты прарабілі шулерскі трук з краплёнымі картамі. Мы з вамі, таварышы, дасканала ведаем аб ажыцьцяўленьні прынцыпу адзіначальля на фабрыцы, што гэты прынцып—адзіначальля ня толькі не патрабуе адмены фабрычна-заводзкіх камітэтаў, але на адварот, апіраецца на моцна скалочаную работу ўсяго фабрычнага трыкутніка: фабрычная ячэйка, фабрычна-заводзкі камітэт і дырэктар-адзіначальнік. Усё пытаньне толькі ў тым, каб унутры трыкутніка правільна разьмеркаваць функцыі і задачы і выразна вызначыць поўную адказнасьць за работу кожнай з частак трыкутніка.

У «Кур'еры Віленскім» на які мы ўжо спасылаліся, зроблена адкрыцьцё, што «ў сваіх вывадах Сталін патрабаваў некаторага (слухайце!) абмежаваньня кіруючай клясы (гэта значыць, рабочай клясы)... (падумайце, на чыю карысьць? ніколі не дадумаецеся) на карысьць прафесыянальнай інтэлігенцыі і беспартыйных працаўнікоў, адмаўленьня ад камуністычных мэтадаў работы і заработнай платы і ўвядзеньня і ў сыстэму -працы і ў акрэсьленьне зарплаты вымяральнікаў, якія ўжываюцца ў капіталістычным сьвеце». У «Кур'еры Віленскім» столькі ілжы, колькі і глупства.

3. „Свабода" друку буржуазіі—свабода хлусьні і паклёпу, свабода атручваньня працоўных мас

Аб ілжы гаварыць ня буду. Кожны з вас у гэтай ілжы добра разьбіраецца. На глупстве я некалькі затрымаюся.

Буржуазны друк гаворыць аб адмаўленьні ад камуністычных мэтадаў працы і заработнай платы. Ці-ж тав. Сталін заклікаў да таго, каб адмовіцца ад вялізарнейшага вагара сацыялістычнага будаўніцтва—ад сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва? Ці-ж тав. Сталін заклікаў рабочую клясу СССР вярнуцца да такіх адносін да працы, якія рабочая кляса мае ва ўмовах капіталістычнай эксплёатацыі, значыць, да работы з-пад палкі, да працы няпоўнакаштоўнай? Зразумела, не. Ці-ж кулацкая ўраўнілаўка зьяўляецца камуністычным прынцыпам заработнай платы, а зьдзельшчына ці прэміяльная сыстэма заработнай платы ў адпаведнасьці з якасьцю працы зьяўляецца адзнакай капіталізму? Але-ж у Форда, сыстэма якога зьяўляецца квіт-эсэнцыяй капіталістычнай эксплёатацыі, няма зьдзельшчыны, а ёсьць падзённая заработная плата і патагонная сыстэма, заснаваная на хуткім руху канвэйера і папрозе галоднай сьмерцю, калі рабочы з работай ля канвэйера, які шалёна ручаецца, ня справіцца. Для чаго буржуазны друк, такім чынам, скажае зьместпрамовы тав. Сталіна? Адказ ясны. Буржуазнаму друку рабочыя, багракі і беднякі ня вераць. Для іх наша будаўніцтва зьяўляецца лепшым прыкладам барацьбы за сацыялізм і шляхаводнай зоркай. Вось чаму яны кідаюць бомбы хлусьні аб тым, што быццам тав. Сталін—правадыр сусьветнага пралетарыяту, якому вы, заходніе таварышы, верыце, гаворыць аб абмежаваньні заваяваных пралетарыятам правоў. Сэнс гэтай хлусьні зводзіцца да таго, каб пераканаць рэвалюцыйныя масы Захаду, якія пачынаюць усё больш бунтаваць у сувязі з крызісам і беспрацоўем, што ўсе шляхі вядуць, урэшце, да абмежаваньня правоў пралетарыяту, нават калі ён заваюе сабе панаваньне. Буржуазны друк і яго тэлеграфныя агенцтвы ў момант разгортваньня крызісу капіталістычнай сыстэмы прабуюць параліжаваць волю да барацьбы рабочых мас указаньнем, што і ў Савецкім Саюзе мае месца банкрутства сацыялістычнай гаспадаркі, банкрутства пралетарскага мэтаду гаспадарчага будаўніцтва, што гэты мэтад сябе не апраўдаў, што ў выніку бальшавіцкіх экспэрымэнтаў на чатырнаццатым годзе рэвалюцыі ёсьць паварот на шлях капіталізму.

Рост беспрацоўя, банкрутства буйнейшых банкаў, няўпэўненасьць буржуазіі ў заўтрашнім дні, абвастрэньне клясавай барацьбы батракіх, сялянскіх мас— вось фон буржуазнай ілжы. Ад сюль тлумачэньні прамовы тав. Сталіна і апошніх дэкрэтаў савецкай улады Па думцы «Газэты Польскай»—Польшчы «рашэньне Сталіна адносна зьмены курсу савецкай палітыкі афармілася тыдзень таму назад, пад уплывам данясеньняў аб катастрафічным становішчы прамысловасьці, а таксама аб небясьпечным хваляваньні сярод рабочых». Гэта ў Рызе выдумная сэнсацыя можа выклікаць у нашых радох толькі вясёлы сьмех.

Рыскія карэспандэнты нават ведаюць, што «зрыў пяцігодкі набыў настолькі выразныя формы, што таварыства так званых «старых бальшавікоў» выслала дэлегацыю да Сталіна з мэтай пераканаць яго аб неабходнасьці зьмяніць курс». (Гучныя выбухі сьмеху. Чытаю і вачом ня веру. Аказваецца што я, напрыклад, член таварыства «старых бальшавікоў», ня ведаў аб тым, што я галасаваў за пасылку дэлегацыі да правадыра нашай партыі тав. Сталіна, каб пераканаць яго ў неабходнасьці зьмяніць курс, і аб усім даведаўся толькі з лейб-органу пілсудчыкаў. (Сьмех).

Гэта «утка» буржуазнага друку, якая дае вам меру таго, што называецца пабуржуазнаму «аб'ектыўнай» праўдай і для чаго служыць буржуазіі свабода слова, патрэбна была з падвойнай мэтай: па-першае, каб рабочым Захаду сказаць, што рэвалюцыя заўсёды канчаецца контр-рэвалюцыяй, і тое,, супроць чаго бальшавікі ў 1921 г. змагаліся, а іменна супроць контр-рэвалюцыйнага лёзунгу: «Саветы без каму ністаў», яны самі быццам праводзяць у 1931 г.—у трэцім годзе пераможнага ажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры гады; па-другое, буржуазны друк прабаваў утаіць перад рабочымі і дробна буржуазнымі масамі Захаду тое вялізарнае ўражаньне на маладых вучоных, якое зрабіла выступленьне баявой савецкай дэлегацыі навуковых працаўнікоў на Лёнданскім кангрэсе, пры сьвечаным гісторыі гэхніці. Буржуазія на час дакладаў савецкіх дэлегатаў абвясьціла пасяджэньне кангрэсу закрытым і забараніла агалашаць стэнограмы дакладаў. Аднак, устаіць вялізарнае рэвалюцыянізуючае значэньне дакладаў савецкіх вучоных, іх важўні ныя выступленьні ў абарону дыялектычнага матэрыялізму, іх атаку на цьвярдыні буржуазнага контр-рэвалюцыйнага сьветапогляду нельга было, таму буржуазны друк прабаваў параліжаваць дзейнасьць выступленьня савецкай дэлегацыі шляхам гэтых недарэчных выдумак, якія ў вас з намі выклікалі выбухі жыцьцярадаснага сьмеху.

Гэтыя прыклады, якія я прыводзіў, зьяўляюцца лепшым выкрыцьцём сутнасьці буржуазнага друку, сутнасьці таго, што ўстойваецца пад назвай буржуазнай свабоды слова. Гэта свабода хлусьні, свабода атручваньня працоўных мас.

4. Сацыял-фашысцкі друк--лёкай капіталізму

Нельга, аднак, канчаць справу на буржуазным друку. Неабходна пазнаёміцца, для чаго служыць буржуазная свабода слова меншавіком-сацыял-фашыстым. Рухаючай сілай сацыял-фашызму зьяўляецца таксама, як і ў буржуазіі, сьмяротны страх перад нашымі дасягненьнямі, перад нашым рухам на перад да сацыялізму. Сацыял-фашысты прабуюць пераканаць рабочых Захаду сьледам за буржуазным друкам, што нямa для чаго рабіць рэвалюцыю, бо кожная рэвалюцыя канчаецца контррэвалюцыяй. Інакш гэту думку право дзіць друк, што прадстаўляе гаспадароў, інакш лёкаі з сацыял-фашысцкіх партый. Усё пытаньне толькі ў слоўным афарбленьні. Сацыял-фашысты па ратуючуць барацьбу рабочай клясы шляхам спэкуляцыі на левай апазыцыйнай фразе. Вось прыклады.

Да нас нядаўна ў Савецкі Саюз прыяжджала дэлегацыя польскіх капіталістаў. Польскія буржуа прыехалі да нас рабіць справы і бліжэй пазнаёміцца са сваім сьмяротным ворагам, праверыць яго сілы і магчымасьць. Буржуазія, зразумела, зацікаўлена ў тым, каб сярод рабочых і дробна-буржуазных мас пашыраць аб нас хлусьню, каб утаіць ад нас праўду. Аднак, для сябе яна хоча ведаць аб нас праўду, бо стары стратэгічны прынцып абазначае: «ворага неабходна дакладна ведаць, трэба ведаць яго слабыя бакі, але не перамяншаць яго моцных бакоў. Таму даклад лідэра польскіх капіталістаў Вяржбіцкага заключае вельмі многа цікавых заўваг, якія адлюстроўваюць сапраўднае становішча спраў у Савецкім Саюзе. Зразумела, побач з гэтымі заўвагамі ёсьць рад іншых, якія проста могуць выклікаць у нас гіранічныя адносіны і сумненьне наконт разумовых здольнасьцяй лідэра польскай буржуазіі.

Сацыял-фашыст зацікаўлен у адным: захаваць лад капіталістычнай эксплёатацыі і сваё цёплае месца. Але гэта можна зрабіць толькі такім чынам, каб увесь час сядзець на двух крэслах: гасіць пажар пралетарскай рэвалюцыі і адначасова рабіць апазыцыйны шум. І капітал набыць, і цноту захаваць. Таму, ня ў прыклад капіталістам, яны ніводнага слова праўды аб Савецкім Саюзе на свае сторонкі не прапускаюць і агідна хлусяць

Даклад т. Будзінскага*)

жыць сацыял-фашысцкаму друку буржуазная свабода друку.

За апошні час у радох ворагаў пралетарскай рэвалюцыі зявіліся і новыя фігуры.

На старонках буржуазнага друку гарцуе Леў Троцкі, у мінулым меншавік з ультра-левымі загібамі, потым чалавек, які ішоў каля нашай партыі даволі доўгі час, гадоў дзесяць з дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. Зараз гэты рэнэгат, выкінуты з Савецкага Саюзу, вурнуўся ў бацькаўскі дом буржуазіі і паказаў свой твар. Гэты твар настолькі агідны, што найбольш сэн тымэнтальны каляпартыйны абываталь ня можа не адвярнуцца з пагардай ад гэтага рэнэгата.

Мы з вамі, таварышы, бачым на ўсіх гэтых прыкладах, чаму служыць свабода друку па-буржуазнаму, і на нашым прыкладзе, на прыкладзе Савецкага Саюзу, мы з вамі бачым, чым зьяўляецца істотная свабода друку, свабода друку для пралетарыяту. Свабода друку па-буржуазнаму служыць буржуазіі і яе агентам і саюзьнікам— сацыял-фашыстам і контр-рэвалюцыйным трацкістам— для закабаленьня рабочае клясы, для таго, каб параліжа вань яе волю да барацьбы.

У нас пралетарская свабода друку служыць справе сацыялістычнага будаўніцтва, справе поўнага вызваленьня працоўных.

Мы выступаем супроць усякіх спроб заціснуць ПРАЛЕТАРСКУЮ самакрытыку і рашуча зацісканем і адбіраем свабоду контр-рэвалюцыйнай агітацыі.

Яны ў краіне капіталу заціскаюць пралетарскую крытыку, заціскаюць і адбіраюць у нас свабоду рэвалюцыйнай агітацыі, даючы поўную свабоду сацыял-фашысцкім і рэнэгацка-трацкісцкім паклёпам супроць пралетарыяту і яго партыі.

У той самы момант, калі мы амаль у 20 раз за гэтыя два гады памножылі колькасьць рабсельваенкораў, калі мы замест 15 друкаваных газэт, што выхо дзілі два года таму назад, маем сёньня 57 друкаваных газэт з вялізарным мільённым тыражом і 50 фабрачна-заводзкіх шматтыражак з тыражом каля 100 тыс. экземпляраў у той час, як наш друк свабодна арганізуе рабочую клясу і бядняцка-серадняцкія масы вёскі на будаўніцтва сацыялізму, на ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту, у гэты час у Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне пралетарскі друк заборонен, рэвалюцыйныя пралетарскія арганізацыі загнаны ў падполье.

Ні адна газэта, якая сапраўды стаіць на варце інтарэсаў рабочае клясы ды працоўных мас вёскі фашысцкай Польшчы, ня існуе легальна. Органы кампартыі, яе лістоўкі выдаюцца і распаўсюджваюцца нелегальна. За рас паўсюджваньне камуністычных лістовак, якія заклікаюць да забастовак, да салідарнага падтрыманьня бастуючых рабочых рабочымі небастуючых прадпрыемстваў, палітычных дэманстрацый і выступленьняў, фашысцкія суды прыгаворваюць да шмат гадоў катаржнай турмы. Нават дзяцей і моладзь 16 - 17 год фашысцкія суды за распаўсюджваньне камуністычных або камсамольскіх выданьняў прысуджаюць да 4 - 5 год катаржнай турмы. У час арышту і пры допыце гэту моладзь жорстка зьбіваюць, у турме тры маюць яе ў такіх умовах, што пасьля скончэньня тэрміну прыгавору гэта моладзь з турмаў выходзіць інвалідамі.

Вось вам жывы прыклад. Адзін наш таварыш быў рэдактарам легальнай газэты, якая выдавалася ў Кракаве. Гэту газэту на любой прычыне і без прычыны паліцыя закрывала або штрафавала. Але рабочая маса сваімі грашовымі ўзносамі падтрымлівала газэту, і газэта праз увесь час выходзіла. Гады агенты дэфэнзывы перад дзьвярыма пакою, у якім жыў наш таварыш, падкінулі пачку канфіскаваных камуністычных лістовак. На гэтай падставе нашага таварыша прысаварылі да 10 год катаржнай турмы, а газэту закрылі. Вось вам твар буржуазнай свабоды друку. Гэты факт зьяўляецца тыповым, такія прасьледваньні пралетарскай або лева-сялянскай прэсы маюць месца на ўсім абшары Польшчы. Асабліва лютуе фашысцкі тэрор супроць пралетарскага лева-сялянскага і нацыянальна-вызваленчага друку на мануканаваных тэрыторыях Заходняй Беларусі і Зах. Украіны.

Ня думайце, таварышы, што ў фашысцкай Польшчы забаронен толькі камуністычны друк. Гэта памылка. Буржуазія забараняе кожную газэту, якая рашуча ставіць пытаньне аб барацьбе працоўных і эксплёатаваных мас за іх сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Сялянскія масы, пад кіраўніцтвам пралетарыяту, працуюць стварыць свой друк, які прапагандуе лёзунг «зямля—сялянству бяз выкупу», дзе яны пішуць, што гэту зямлю бядняцка-серадняцкія масы могуць здабыць толькі ў саюзе і пад кіраўніцтвам рабочае клясы, у барацьбе супроць буржуазіі і кулацтва. Даволі гэту фразу напісаць, або даволі напісаць такі артыкул, у якім паміж радкоў пра сьвечваліся-б гэтыя лёзунгі, каб газэта канфіскавалася, а рэдактар адпраўляўся ў турму. Толькі на працягу аднаго 1927 г. лева-сялянская нацыянальна-вызваленчая газэта Зах. Беларусі семнаццаць раз закрывалася. У сувязі з гэтым 17 чалавек рэдактароў былі прыгавораны да турэмнага зьняволеньня ад ½ года да 3 год. Колькасьць канфіскацый і штрафаў літаральна нельга падлічыць. За гэты год газэта канфіскавалася ня менш 50 раз і прыгаварвалася да штрафаў ня менш чым 100 раз. Нарэшце, фашысцкі ўрад і гэту газэту закрыў, забараніўшы друкарням прымаць у работу лева-сялянскія газэты, нават пры існаваньні фармальнага дазволу з боку фашысцкай улады на выданьне іх.

Вось нам малюнак свабоды друку па-буржуазнаму. Ясная справа, калі клясавы вораг настолькі баіцца нашага рэвалюцыйнага слова або рэвалюцыйнага слова лева-сялянскіх дзеячоў, якія ідуць у саюзе з рабочай клясай, мы можам пераканацца, якой вялізарнейшай сілай зьяўляецца друкаванае слова ў руках пралетарыяту, якім кіруе камуністычная партыя.

***

У другой частцы свайго дакладу тав. Будзінскі падрабязна спыняўся на задачах рабселькораўскага руху, цэнтральнага і нізавога друку, на задачах разгортваньня пралетарскай самакрытыкі.

Тав. Будзінскі канчае свой даклад упэўненасьцю ў тым, што перабудова рабселькораўскага руху, якая яшчэ больш наблізае армію рабселькораў да канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва і павышае іх удзел у гэтым будаўніцтве, у барацьбе за міжнародную пралетарскую рэвалюцыю, за абарону краіны Саветаў, гэта перабудова будзе фарсаваным тэмпам завершана пад непасрэдным кіраўніцтвам партарганізацый, што яно забясьпечыць далейшы рост рабселькораўскага руху і ўедым яго на вышэйшую ступень.

*) Канец. Пачатак на 2 стар.

ЦК КП(б)Б, СНК БССР

Першая Ўсебеларуская нарада загадчыкаў сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм шле гарачае прывітаньне стойкаму бальшавіцкаму ЦК КП(б) і Ураду БССР.

РАПАРТУЕМ: Калгасьнікі пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК па бальшавіцку б'юцца за выкананьне пастаўленых партыяй і ўрадам задач па арганізацыі 1300 таварных, сьвінагадоўчых, калгасных фэрм, давядзеньня матачнага пагалоўя ня менш 150000 і здачы для рабочых цэнтраў 210 тысяч адкормленых сьвіней. Пратвараючы ў жыцьцё лёзунг аб аўладаньні тэхнікай у сьвінагадоўлі, праводзячы ўсю работу на аснове ўдарніцтва, сацспаборніцтва і зьдзельшчыны, мы, ускладзеныя на нас партыяй і рабочай клясай задачы, выканаем.

Шырэй дарогу разьвіцьцю калгаснай сьвінагадоўлі. Дамо рабочаму салу, мяса. Толькі сацыялістычная гаспадарка здольна вырашыць мясную праблему.

Няхай жыве камуністычная партыя, няхай жыве савецкая ўлада, няхай мацнеюць СТКФ!

ПРЭЗЫДЫУМ НАРАДЫ.

Пастанова

Ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў па дакладах т. т. Будзінскага і Курціка

2-гі Ўсебеларускі зьезд рабселькораў, заслухаўшы даклады тт. Будзінскага і Курціка па пытаньні рабселькораўскага руху, партыйнага кіраўніцтва ім і ўдарніцтва ў друку, а таксама паведамленьне аб рабоце 14-ці сэкцый Ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў—тт. Плоткіна (сэкц. мэталяапрацовачных прадпрыемстваў), т. Красінай (сэкцыя чыгуначна-воднага і шоснага транспарту), т. Мінкіна (сэкцыя гарбарна-абутковай прамысловасьці), т. Платава (сэкцыя энэргетыкі і торфу), т. Вержбаловіча (сэкцыя дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, т. Мікайлава (сэкцыя жывёлагадоўлі), тав. Лебедзева (сэкцыя тэхнічных культур), т. Кучынскага (сэкцыя перабудовы спажывецкай кааперацыі), т. Гарбунова (сэкцыя машына-трактарных станцый), т. Бэра (сэкцыя швэйнікаў і тэкстыльшчыкаў), т. Рагазіньнікавай (сэкцыя рабселькораў), т. Чэрыкава (сэкцыя жывой тэатралізаванай газэты), т. Малкіна, (сэкцыя паперы і паліграфіі) і т. Прынца (сэкцыя шкла)— пастанаўляе:!

1. Далучыцца да пастаноў апошняй ўсесаюзнай нарады па пытаньні рабселькораўскага руху пры «Правде», улічваючы, што канкрэтныя задачы рабселькораў БССР па асобных, важнейшых галінах народнай гаспадаркі БССР вызначаны ў пастановах сэкцый ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў.

2 Распрацаваныя ў 14 сэкцыях усебеларускага зьезду рэзалюцыі з усімі прынятымі сэкцыямі дадаткамі і зьменамі—зацьвердзіць. Канстатаваць, што ў распрацоўцы і абгаварэньні праекту рэзалюцыі сэкцый зьезду, прыняла непасрэдны актыўны ўдзел 90 проц. агульнай колькасьці дэлегатаў зьезду.

3. Забясьпечыць бездакладную масавую і грунтоўную прапрацоўку пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў, а таксама пастаноў усесаюзнай нарады пры «Правде» на спэцыялізаваных зьлётах рабсельваенкораў на асобных прафэсіях, з шырокім прыцягненьнем спэцыялістаў, гаспадарнікаў і прафработнікаў.

АД РЭДАКЦЫІ: рэзалюцыі нарады пры «Правде» і усебеларускага зьезду рабсельваенкораў будуць зьмешчаны ў бліжэйшых нумарох.

Другі этап культэстафэты—2-хдэкаднік трывогі

Падрыхтоўку да навучальнага году— НА БАЯВЫЯ ТЭМПЫ

У Лепельскім раёне зрываецца плян будаўніцтва школ. Зусім не разгорнута падрыхтоўка да навучальнага году ў Нараўлянскім раёне

За час двухдэкадніка трывогі ліквідаваць прарывы ў падрыхтоўцы да навучальнага году

Будаўніцтва школ ня рухаецца з месца ў Лепельскім раёне

Ня гледзячы на дырэктывы партыйных і савецкіх органаў, ня гледзячы на тое, што да пачатку навучальнага году застаўся толькі адзін месяц, раённыя арганізацыі і ўстановы Лепельшчыны пытаньню падрыхтоўкі да новага навучальнага году адводзяць зусім мала ўвагі. Праўда, былі прыняты адпаведныя пастановы па гэтым пытаньні, але яны засталіся толькі на паперы. Акрамя інспэктуры нарасьветы, гэтай справай мала хто цікавіцца.

Распачатае летась будаўніцтва школ ня рухаецца з месца. Так, у калгасе «Авангард» (Несенскі сельсавет) падвезены лес лежыць неабкораным і псуецца, работы па пабудове ніякай не вядзецца; у вёсцы Ворань (Воранскі сельсавет) яшчэ ў 1930 годзе вывезена частка лесаматар'ялу, якая дагэтуль не скарыстоўваецца—школа ня будуецца. Прыблізна такі-ж малюнак з школьным будаўніцтвам у в. в. Стаі, Вялейшчына і Весялова.

Раённы тэхнік заявіў, што «пабудова школ, акрамя Весялоўскай, у бягучым годзе ня будзе закончана».

Ня лепш абстаіць справа і з рамонтам школ. Да рамонту іх яшчэ ня прыступлена. Больш таго, дагэтуль не загатоўлены для рамонту лесаматар'ял, вапна і цэгла.

Яшчэ горш справа з забесьпячэньнем школ школьнай мэбляй. Для новаадчыняемых камплектаў і для папаўненьня мэбляй існуючых школ патрэбна 600 школьных лавак, некалькі дзесяткаў сталоў і шаф. Дошак-жа для вырабу школьнай мэблі не загатоўлена, нават і лесаматар'ялу на дошкі няма.

Наколькі Лепельскія райвыканком і гарсавет клапоцяцца аб школьнай справе можна бачыць з наступнага факту.

Трэба было ў Лепелі ўстанавіць радыявуазёл. Гарсавет другога выхаду не знайшоў, як забраць адзін будынак яўрэйскай школы (школа вымяшчаецца ў 3-х будынках), у якім вымяшчаліся нулявая група, фізгабінэт, рабочы пакой і кватэра загадчыка школы. У палове ліпеня з санкцыі старшыні РВК будынак школы забіраецца пад радыявузёл, а школе абяцаюць даць будынак... інтэрнату белпэдтэхнікуму. Дырэктар тэхнікуму заявіў, што ён гэтага будынку не аддасьць школе, бо тэхнікуму з новага навучальнага году для інтэрнату патрабуецца яшчэ адзін будынак ня менш як на 100 асоб. Гарсавет абяцаў справу вырашыць і даць яўрэйскай школе іншы будынак, адрамантаваўшы яго за свой кошт. Аднак, да гэтага часу гарсавет яшчэ нічога ня робіць у гэтым напрамку.

Райвыканком павінен зараз-жа пабаяцца ўзяцца за падрыхтоўку да новага навучальнага году, школы могуць і павінны быць пабудаваны. Яўрэйская школа павінна неадкладна атрымаць памяшканьне.

А. Мачульскі.

Барысаў пачаў 2 дэкаднік трывогі

Па Барысаўскім раёне ў падрыхтоўцы да навучальнага году маецца значны прарыў. Па раёне не хапае 37 будынкаў пад школы. Пачатае плянавае будаўніцтва 6 школ спынена, бо ЦПТаўскія брыгады зьняты і перакінуты на іншую работу. Школы яшчэ не ўкамплектаваны настаўнікамі, з боку якіх назіраецца значная цякучасьць.

Дрэнна стаіць справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці. У мінулым годзе ліквідацыяй няпісьменнасьці было ахоплена толькі 76 проц. дарослага насельніцтва (у тым ліку і рабочых).

Некаторыя арганізацыі да гэтага часу не ўсьвядомілі палітычнай важнасьці правядзеньня ліквідацыі няпісьменнасьці. Брыгадзе на перавучоту няпісьменных на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» адказалі:

«Чаго вы лезеце да нас са сваёй ліквідацыяй няпісьменнасьці. У нас маюцца больш важныя справы. Мы ліквідуем прарыў у выкананьні прамфінпляну».

Вось характэрная заява тых, хто не разумее, што выкананьне прамфінпляну залежыць і ад ліквідацыі няпісьменнасьці сярод рабочых. Гэткія апартуністычныя разважаньні тлумачацца тым, што і райпрафсавет разам з фабзаўкомамі напляваецьскі, апартуністычна адносяцца да ліквідацыі няпісьменнасьці і справы аўладаньня тэхнікай. Адчуваецца недаацэнка гэтай справы і з боку РК ЛКСМБ.

Двухдэкаднік трывогі павінен даць належны штуршок.

Складзена пяцёрка па двухдэкадніку. Намечаны канкрэтны плян дзейнічаньня, мабілізавана 10 чал. культармейцаў, якія пасланы на раён. На прадпрыемствах вылучаны асобы, адказныя за правядзеньне двухдэкадніка трывогі. Праца пачынае пакрыху разгортацца і трэба спадзявацца, што агульнымі сіламі прарывы будуць ліквідаваны.

А. Пялінскі.

Няма ніякай падрыхтоўкі да навучальнага году

Да пачатку заняткаў у школах застаўся толькі адзін месяц, але падрыхтоўка да навучальнага году па Нараўлянскім раёне яшчэ не пачалася. Старыя школы яшчэ не рамантуюцца. Будоўля новых ідзе занадта павольнымі тэмпамі. Аконская, Дзярнавецкая, Акулінкаўская і Беласарацкая школы пачалі будавацца яшчэ ў мінулым годзе і пры тых тэмпах, якімі ідзе будаўніцтва, яны ня будуць скончаны і ў гэтым годзе. Для новаадчыняемых камплектаў памяшканьні яшчэ не падрыхтаваны. Ні РВК, ні сельсаветы не ўдзяляюць належнай ўвагі гэтаму пытаньню.

Абсталяваньнем школы забясьпечаны недастаткова, наглядных дапаможнікаў па школах амаль што няма. Новых праграм школы яшчэ не атрымалі, а час ужо іх прапрацоўваць. Няма і падручнікаў у кнігарні Нараўлянскага спажывецкага таварыства.

Аб забесьпячэньні школ дровамі на новы навучальны год таксама ніхто яшчэ ня думае. Бярозаўскі сельсавет дайшоў нават да таго, што і застаўшыяся дровы ў Майданскай нямецкай ШКМ забраў невядома куды і на што.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што па раёне адчуваецца недахват педкадраў.

Райвыканком і раённыя арганізацыі павінны ўзяцца за ліквідацыю прарываў на фронце падрыхтоўкі да навучальнага году. За час двухдэкадніка трывогі трэба дабіцца таго, каб усе прарывы былі ліквідаваны.

Асьветнік.

Як Аршанскі жылбуд „будуе школы

Пабудова школ Аршанскім жылбудам вядзецца вельмі марудна і да гэтага часу якасьць будоўлі пакідае жадаць шмат лепшага. Напрыклад, у Крупскім раёне, апроч таго, што школы будуюцца са спазьненьнем на 2 гады супроць тэрміну дагавору і лес, лежучы неакораным, значна папсаваўся, сама пабудова вядзецца нядбайна і без належнага тэхнічнага нагляду. За фактамі далёка не хадзіць. На пабудове Крупскай сямігодкі робіцца каталаван, у які ўкладваецца каменьне без залёўкі цэментам, знадворныя сьцены выводзяцца ў некаторых мясцох амаль бяз «дракі», што зьмяншае іх моцнасьць; нядбайна вядзецца пракладка сьцен пакляй, дзякуючы чаму ўжо пачынаюцца сьвецяцца сьцены. Частка лесаматар'ялу зьнічаецца сямі цесь лярамі на апал.

Дзясятнік Сідарэнка не наглядае за пабудовай, а вельмі часта бывае пад «градусам». Сярод цесьляроў пануюць рвацкія настроі, дзякуючы якім цесьляры прад'яўляюць немагчымыя патрабаваньні, пагражаюць кінуць работу. Саюз будаўнікоў палітвыхаваўчай работай не ахапіў рабочых-будаўнікоў.

Аб гэтых недахопах сыгналізуем Аршанскаму жылбуду, якому неабходна больш пільна сачыць за пабудовай школ. Саюзу будаўнікоў трэба ўзмацніць палітвыхаваўчую работу сярод рабочых будаўніцтва.

А. Крынічны.

У бой за торф



Горацкі РВК ня цікавіцца справай здабываньня торфу

У тарфяной арцелі «Карысьць» вёскі Вальнцова, Горскага сельсавету, Горацкага раёну, па заданьні павінна быць выраблена торфу 2.000 к.с., а выканана гэтае заданьне толькі на 7 проц.

Як аднаасобнікі, так і калгасьнікі вёскі Вальнцова сельсаветам на торфараспрацоўкі не мабілізаваны.

Райвыканком па-апартуністычнаму адносіцца да работы па торфаздабываньні, гэты райвыканком ня лічыць патрэбным паставіць пытаньне праз сельсавет аб папулярызацыі гэтага важнага мерапрыемства; РВК працоўнаю сілою таксама не цікавіцца.

Горскі сельсавет ні разу не заслухаў справаздачы старшыні торфараспрацовак, між тым як сельсавет павінен быў заслухаць гэтую справаздачу і даць належныя ўказаньні ў рабоце торфараспрацовак.

Ёсьць выпадкі, калі старшыня торфараспрацовак Струмужэўскі вельмі агідна адносіцца да калгасьнікаў, якія працуюць на торфараспрацоўках.

Трэба моцна ўдарыць па апартуністах, якія зрываюць выкананьне пляну па торфаздабываньні. Трэба зараз жа ўзьняць бальшавіцкія тэмпы і ударнаму выканаць і перавыканаць дадзеныя пляны.

Ударная рабселькораўская брыгада: Кейгелес Язэп, Зьмітрыеў, Туркоў, Маркаў Міхась.

Зводка

выкананьня пляну па здабываньні торфу на торфазаводах БССР за 19 ліпеня 1931 г.

Назва заводаў	Проц. выкан.
1. „Ленінскі Шлях“	95,7
2. „Чырвоны Тарфянік“	84,4
3. Закрашынскі Мох	72,8
4. Давыдаўка	55,5
5. „Шлях Сацыялізму“	44,0
6. „Бальшавік“	41,0
7. Асінторф	39,8
8. „Свабода“	39,0
9. „Чырвоная Беларусь“	36,1
10. Міхановічы	31,5
11. Грэбнёва	26,2
12. Імя Даўмана	15,9
13. Вялікі Мох	15,9
14. „Новая Беларусь“	12,4
15. „Першага Мая“	12,2
16. „Чырвоны Кастрычнік“	8,9
17. Рамізава	6,0

Тодар Алесін

Ліст торфакопам „Вольніцы“

Торфарабочыя заводу «Вольніца» на 17-га ліпеня 1931 г. выканалі свой сэзонны плян толькі на 0,7 процанта.

Краіна
Напружаных мускулаў,
Краіна,
Дзе мчыцца ўсё коньніцай,
Дае
Баявую нагрузку вам,
Торфарабочыя,
«Вольніцы»!..
Сягодня-ж
Вашых абліччаў
Ня савіць кляса
Парывамі:
Крывая па торфаздабычы
Зіяе ганебна—
Прарывамі!

Глядзеце ў вочы нам проста,
Скажам вам—
Хоць без эстэтыкі—
— На базе магутнага росту
Беларуская энэргетыкі
Завод ваш
На многа адсоткаў
Пляцецца ў хвасьце фэдэрацыі!
Якія ўжывалі вы сродкі
Для ліквідацыі
Прагулаў,
Прастояў рабочых—
Без мэтнасьці?
Глядзеце нам проста ў вочы:
— Працуеце вы—
Без эфэктнасьці!
Краіна
Напружаных мускулаў,
Краіна,
Дзе мчыцца ўсё коньніцай,
Дае баявую нагрузку вам:
Зьніччыць!
Прарывы па «Вольніцы»!

Менск.

25 ліпеня 2-гі ўсебеларускі зьлёт юных ленінцаў

25 ліпеня адкрываецца 2-гі ўсебеларускі зьлёт юных ленінцаў. Зьлёт падагуліць праробленую работу па ўдзелу дзяцей працоўных на вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, вызначыць шляхі далейшай працы. Зьлёт прадэманструе перад працоўнай грамадзкасьцю ўдзел дзяцей у сацыялістычным будаўніцтве.

Адным з мерапрыемстваў зьлёту піянэраў зьяўляецца выстаўка, у задачы якой уваходзіць асьвятленьне практычнай працы піянэрарганізацыі за прамфінплян, за калектывізацыю, нацыянальна-культурнае будаўніцтва. Выстаўка адкрываецца 26 ліпеня а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні 2-й школы па Ленінскай вул., супроць пошты. У мэты выстаўкі уваходзяць задачы ня толькі паказаць работу дзяцей, але і задачы мабілізацыі дзяцей працоўных на яшчэ большы ўдзел ва ўсіх вучастках будаўніцтва, а таму неабходна, каб рабочая грамадзкасьць азнаёмілася з працай і задачамі працоўнай дзетвары на дапамогу ў вырашэньні задач, што стаяць перад усімі пакаленьнямі працоўных.

Т. т. рабочыя і работніцы, працоўныя Менску! прыходзьце на выстаўку 2-га ўсебеларускага зьлёту юных ленінцаў, вашай парадай і дапамогай трэцяму пакаленьню вы дапаможаце вырашэньню агульных задач, якія стаяць перад партыяй і рабочай клясай.

Цэнтральны штаб па скліканьні 2-га ўсебеларускага зьлёту юных піянэраў пры ЦК ЛКСМБ.

Суботнік па ліквідацыі прарыву ў шляхавым будаўніцтве

ПУХАВІЧЫ, 22. (Белта). Пухавіцкі РК КП(б)Б і РВК абвясьцілі 19 ліпеня суботнік для ліквідацыі прарыву па вывазцы каменьня на будаўніцтва шляхаў. Дзякуючы правільнаму растлумачэньню важнасьці гэтай справы работнікамі дыстанцыі № 9 і ячэйкамі КП(б)Б суботнік прайшоў з вялікім посьпехам. Па 11 сельсаветах выехала 1.950 фурманак. Лепшыя з іх—Кнорынскі сельсавет—314 фурманак, Блонскі—204 фурманкі, Наватурынскі, на тэрыторыі якога мала каменьня і то выехала 150 фурманак.

Былі выпадкі, калі выяжджалі на маладых конях (2½ гады), заяўляючы: «Як-жа я застануся няўдзельнікам у сацбудаўніцтве?».

Суботнік прайшоў з вялікім энтузіязмам.

Уборачную эстафэту Саветаў— НА ПОЎНЫ ХОД

Калгасы Чырвонка-Слабодзкага раёну і камуна „Авангард“ па-бальшавіцку змагаюцца за ўшчыльненьне тэрмінаў уборкі

Прыгарадныя гаспадаркі Менскага і калгасы Бярэзінскага раёну ня справіліся з сенаўборкай

ПЕРАДАВЫЯ САЎГАСЫ, КАЛГАСЫ—БЯРЭЗЦЕ НА БУКСІР АДСТАЮЧЫХ

Пашыраюцца рады ўдзельнікаў уборачнай эстафэты саветаў

ВІЦЕБСК (па тэлеграфу ад наш. кар.). Віцебскі гарсавет уключыўся ва ўборачную эстафэту саветаў. Прыняты рад канкрэтных абавязацельстваў па выкананьні ўсіх маршрутаў. Мабілізаваны савецкі актыў.

Чакаем адказу Гомельскага і Магілеўскага гарсаветаў

Да 23-VII па ўборачную эстафэту ўключыліся: Менскі і Віцебскі гарсаветы, Ельскі раён, сельскія саветы Менскага раёну, Зембінскі сельскі савет, Барысаўскага раёну, і рэдакцыя газэты «Бальшавік Барысаўшчыны».

На выклік Менскага гарсавету яшчэ не адказалі Гомельскі і Магілеўскі гарсаветы.

Камуна „Чырвоны Артылерыст“ перайшла на зьдзельшчыну

Камуна «Чырвоны Артылерыст», Махраўскага сельсавету, Полацкага раёну, поўнасьцю перайшла на зьдзельшчыну. Складзены ўдарныя брыгады. Зараз калгас канчае сенаўборку. У часе сенаўборкі нормы выпрацоўкі перавыконваліся. Некаторыя ўдарныя брыгады нормы выпрацоўкі перавыконвалі на 12—15 проц.

Яз. Саўчанка.

Камуна „Авангард“ жала 70 проц. ржыта

Дзякуючы правільнай расстаноўцы рабочай сілы, сацспаборніцтву, ударніцтву і ўвядзеньню зьдзельшчыны камуна «Авангард» Старадароскага раёну, 10 ліпеня пасьпяхова скончыла ўборку сенажаці і прыступіла да ўборкі збожжа.

На 15-га ліпеня жжата 70 проц. ўсёй плошчы азімага кліну. Уборка жыта будзе скончана да 23-га ліпеня.

Зараз закладваецца сіласная паўвежа на 133 тоны сіласу.

Брыгада: С. Сяргейчык, А. Гундараў.

Ударыць па бясплянавасьці ў рабоце Менскіх прыгародных гаспадарак

Праполка гародаў і ўборка ўраджаю ў Менскіх прыгародных гаспадарках—саўгасах і калгасах праходзіць марудна. Поліва выканана па саўгасах на 70 проц., сенаўборка—на 45 проц., сілсаваньне кармоў зусім не пачата. На калгасах плян поліва выкананы на 75 проц., будаўніцтва сілосных установак выканана—на 0,9 проц., ня гледзячы на тое, што да 1-га жніўня г. г. буданіцтва павінна быць поўнасьцю закончана.

Дрэнна пастаўлена справа з запозам уборачных машын. Па калгасах зараз не хапае 50 сенакасілак, 120 конных грабель, 120 снопавязалак, 40 жняярак; бульбакапалак і інш. с-г машын зусім не завезена.

Гэтыя прарывы стварыліся, галоўным чынам, у выніку дрэннай пастаноў кі кіраўніцтва саўгасамі і калгасамі. Галоўныя памылкі—гэта адсутнасьць плянаў работы, расстаноўкі і скарыстаньня рабочай сілы і машын. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва адсутнічаюць, узаемадапамога паміж саўгасамі і калгасамі не практыкуецца.

Менгарсавет слаба дапамагае прыгародным гаспадаркам арганізаваць уборку ўраджаю і поліва гародаў. Нічога ня робіцца ў галіне барацьбы са шкоднікамі гародаў.

Недапушчальным зьяўляецца такое зьявішча, калі нерацыяльна скарыстоўваецца рабочая сіла, якая прысылаецца на работу ў гаспадаркі фабрыкамі, заводамі і ўстановамі г. Менску. Адсутнічае плянавае скарыстаньне рабочае сілы. Бываюць выпадкі, калі ў адным саўгасе і калгасе шмат рабочых, а ў другіх зусім няма. Нават там, дзе яе бывае многа, рабочыя часта належна не скарыстоўваюцца. Не заўсёды вызначаюцца нарады, куды каго пасылаць, у выніку чаго рабочым прыходзіцца часта доўга чакаць пакуль іх пашлюць на работу.

Ва ўсёй рабоце прыгародных гаспадарак Менскага раёну трэба ўстанавіць дакладную плянавасьць і чоткасьць. Неабходна рашуча ўдарыць па ўсіх недахопах і на хаду зьнішчыць іх.

Менскія прыгародныя гаспадаркі павінны стаць узорнымі для іншых гародаў БССР.

А. Фандарэнка.

Калгасы Чырвонаслабодзкага раёну скончылі ўборку сена

Калгасы Чырвонаслабодзкага раёну з посьпехам скончылі сенаўборку. Такія перадавыя калгасы, як: «Будзёны», «Майскі Прамень», «Пуцілавец», «Іскры Ільліча» сенаўборку скончылі да тэрміну.

У часе сенаўборкі ў калгасы пачаўся масавы прыліў. За ўсю сенаўборачную кампанію ў існуючыя калгасы раёну ўлілося 200 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і арганізавана 2 новыя калгасы, у якія ўступіла 60 гаспадарак. У калгасах шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва і ў большасьці з іх ўведзена зьдзельшчына. Калгасьнікі выпрацоўвалі падвойную норму ў дзень. Сенаўборку скончылі ў тэрмін.

Зараз калгасы рыхтуюцца да ўборкі збожжа. Па ўсіх калгасах усе ўборачныя машыны адрамантаваны. Правільна разьмеркавана рабочая і цягавая сіла.

Дрэнна абстаіць справа з аднаасобным сэктарам. Аднаасобнікі да ўборкі ня рыхтуюцца. Некаторыя сельсаветы яшчэ нічога не рабілі да ўборачнай кампаніі. Так, Бучацінскі сельсавет нават ня ведае, колькі засеяна ў індывідуальным сэктары жыта і пшаніцы. Растлумачальная работа адсутнічае.

Уборка жыта ў Чырвонаслабодзкім раёне пачнецца 27-га ліпеня.

Алесь Курловіч.

Аздаравіць калгас „Новы Шлях“

У калгасе «Новы Шлях» Юшкаўскага сельсавету, Любаньскага раёну зьдзельшчына ня ўведзена, вучот працы не праводзіцца, працоўных кніжак няма. Калгасьнікі ня ведаюць, колькі яны выпрацоўваюць.

У калгасе адсутнічае ўнутраны распарадак. Аб загатоўчых кампаніях у калгасе ня хочуць думаць. Пры сельсавеце адбылася нарада па пытаньні вывазкі дроў, але гэта чамусьці зусім не датычыць калгасу. Ня гледзячы на тое, што зараз абвешчан месячнік вывазкі дроў, калгас ня прыступіў да гэтай работы.

У калгасе ляжыць 33 цэнтн. нескарыстанага аўса, яго трэба было-б здаць дзяржаве.

Любаньскі Райкалгассаюз павінен зараз-жа ліквідаваць недахопы ў рабоце калгасу і дабіцца пераводу работы ў калгасах на зьдзельшчыну.

М. Кульгавы.

Непарадкі тармозяць сенаўборку

Арганізацыя працы па калгасах Каменна-Борскага сдльсавету пастаўлена дрэнна

Рад калгасаў Каменна-Борскага сельсавету, Бярэзінскага раёну, дрэнна пад рыхтаваліся да сенаўборачнай кампаніі. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута. У калгасах «Рой», імя Молатава, «Дзень Чырвонай арміі» ня складзены нават асобныя брыгады па ўборцы сенажаці.

Няма сталага вучоту працы, што тармозіць уборку. Гэтыя-ж калгасы не перайшлі на зьдзельшчыну, няма сталага падзяленьня працы паміж падлеткамі і дарослымі.

Наглядаецца разбазарваньне маемасьці. Кіраўніцтва калгасаў не вядзе барацьбы з нядбайнымі адносінамі да с.-г. машын і інвэнтару. Некаторыя калгасьнікі хідаюць інвэнтар дзе папала. Ліквідацыя абязьлічкі праходзіць слаба.

Райкалгассаюз і райкаапсаюз таксама дрэнна падрыхтаваліся да сенаўборачнай кампаніі. Калгасы ня поўнасьцю забясьпечаны ўборачнымі прыладамі.

Раённыя арганізацыі і мясцовыя партыйныя камсамольскія ячэйкі павінны зьвярнуць належную ўвагу, каб зьнішчыць гэтыя недахопы і дапаматчы калгасам скончыць сенаўборачную кампанію ў бліжэйшыя дні.

Калгасьнік.

Адсутнасьць зьдзельшчыны ўліку працы—асноўныя прычыны прарываў у камуне імя т. Сталіна

У камуне імя Сталіна, Церахоўскага раёну, зьдзельшчына хоць і ўведзена, але толькі формальна. На практыцы зьдзельшчына ня ўжываецца, за выключэньнем толькі аднэй будаўнічай брыгады. Нормы выпрацоўкі, якія былі зацьверджаны агульным сходам, амаль ня прытрымліваюцца.

Кіраўніцтва камуны мала цікавіцца пытаньнем пераводу на зьдзельшчыну, у гэтай справе няма ніякай выразнасьці. Былі выпадкі, калі жанчынам даваліся непасільныя нормы выпрацоўкі. Часам забываюць запісаць працадні (З. Башлакову), працоўныя кніжкі не раздаць.

Працдысцыпліна ў камуне вельмі слабая, рабочыя часта адмаўляюцца ад вызначанай работы. Калі прышлося нядаўна кідаць стог, дык ніхто не згадзіўся ўзяцца за гэтую работу.

Савет камуны ня прымае ніякіх захадаў для падвышэньня працдысцыпліны.

Грак.

Бяруцца за работу

КРУПКІ (па тэлеграфу ад наш. кар.). Па Крупскім раёне матар'ялы па ўсеагульным навучаньні яшчэ не распрацаваны. Утворан штаб двухдэкадніка трывогі, распрацаван плян дзейнічаньня. Адбылася нарада ўпаўнаважаных, якія выяжджаюць у сельсаветы.

Плакс.

Друк—на дапамогу воднаму транспарту

ГОМЕЛЬ, 22. (Белта). Прыбыў катэр выязной кіеўскай газэты «Прал

Не застанаўлівацца на дасягнутых посьпехах

Больш рашуча перабудаваць работу саветаў

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР па дакладу Гарадоцкага раённага выканаўчага камітэту

Заслухаўшы даклад старшыні Гарадоцкага РВК тав. Сапрыцкага і содаклад інструктара аргаддзелу прэзыдыуму ЦВК т. Носка, аб дзейнасьці Гарадоцкага РВК, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адзначае:

1. Гарадоцкі раён за апошні год перажыў два пэрыяды—пэрыяд «левых» антысераднякіх загібаў, выразіўшыхся ў грубым адміністраваньні пры правядзеньні калектывізацыі, ігнараваньні с-т. арцелі, як асноўнай формы калгаса на даным этапе, і насаджэньні буйных камун у 40.000 га.

2. Аднаўлены склад РВК пад знакам выпраўленьня антысераднякіх парагібаў груба скрыўляў генэральную лінію партыі і ўраду, праводзячы ў сваёй рабоце правую практыку, выразіўшуюся ў скарачэньні тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Ня здолеў паставіць работу с-саветаў па выкананьні задач сацыялістычнага будаўніцтва, ігнараваў работу з батрацтвам і беднатой і зусім не праводзіў рашучай барацьбы з кулацтвам.

3. Калгаснае будаўніцтва не атрымала адбітку ў рабоце РВК і сельсаветаў, у выніку чаго раён да апошняга часу займаў самае апошняе месца ў БССР па калектывізацыі (на 1-II—31 г.—6 проц.).

4. РВК не скарыстаў важнейшай палітычнай кампаніі перавыбараў саветаў, якія праходзілі на ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, для мабілізацыі шырокіх мас рабочых, батрацтва, калгасьнікаў і бяднякка-серадняцкага актыву на вырашэньне задач сацыялістычнага будаўніцтва, у выніку чаго ў некаторыя саветы пралез чужы антысавецкі элемэнт.

Абраны апошнім зьездам саветаў новы склад РВК стаў на шлях рашучай барацьбы за генэральную лінію партыі і ўраду, выпраўляючы апартуністычную работу старога кіраўніцтва, за кароткі тэрмін дабіўся значных посьпехаў ва ўсёй сваёй рабоце:

а) калектывізавана бяднякка-серадняцкіх гаспадарак, замест 6 проц. на 1-II—31 г.,—46 проц. на 20-VI—31 г.;

б) ёсьць рост пасеўной плошчы ў параўнаньні з мінулым годам на 21,11 проц., асабліва ў частцы пасеву тэхнічных культур—лёну: з 3500 га пасеву лёну ў мінулым годзе да 10.650 га ў гэтым годзе (рост на 200 проц.) і кармавых культур—каранплодаў на 236 проц., канюшины на 47 проц. Тым самым РВК вырашае задачу аб спэцыялізацыі с-гаспадаркі раёну, як лёнаводна-тэхнічнага;

в) прыступлена да арганізацыі ў раёне 3-х буйных лёнаводных і жывёлаводных саўгасаў.

Гэтыя посьпехі дасягнуты ў выніку ўзмоцненай работы сярод батрацтва і беднаты, шырокай масавай работы па растлумачэньні пастаноў X Усебеларускага і VI Усесаюзнага Зьездаў Саветаў і закону аб новым адзіным сельска-гаспадарчым падатку, з адначасовым рашучым нажымам на кулацка-заможныя часткі вёскі.

Побач з гэтым у рабоце РВК ёсьць рад недахопаў:

1. Пытаньню жывёлагадоўлі ня было ўдзелена належнай увагі. Ня гледзячы на значнае пашырэньне кліну пасеву кармовых культур і траў, у параўнаньні з мінулым годам, плян пасеву сілосных культур і кораньплодаў гэтага году значна недавыкананы, тым самым ствараецца пагроза падвядзеньню кармовай базы пад разьвіцьцё жывёлагадоўлі.

2. Пытаньню мабілізацыі сродкаў, як адной з галоўнейшых задач партыі і ўраду, з боку РВК ня было ўдзелена належнай увагі, у выніку чаго плян па мабілізацыі сродкаў у першым квартале выкананы на 59 проц. і ў другім—на 62 проц., чым ставіцца пад пагрозу выкананьне гаспадарчых мерапрыемстваў у раёне.

3. Сэкцыі сельсаветаў і групы беднаты ў радзе сельсаветаў зусім не працуюць. Дрэнна пастаўлена праверка выкананьня пастаноў РВК; зусім мала ставілася справаздачных дакладаў сельсаветаў аб іх дзейнасьці на прэзыдыуме РВК. Ёсьць выпадкі, калі ў паасобных калгасах да гэтага часу не разьмеркаваны ўраджай і прыбыткі 1930 году. Большая частка калгасаў да гэтага часу не перайшла на зьдзельшчыну і адсутнічае вучот працы; таксама не ліквідавана абязьлічка. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах разгорнута зусім слаба. Да гэтага часу слаба практыкавалася перадача лепшага вопыту старых калгасаў у новыя калгасы.

Адсутнічае вучот беднаты і батракоў у калгасах. Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі яшчэ дастаткова не разгорнута. Спажывецкая кааперацыя не перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з рашэньнем ЦК УсеКП(б) і СНК СССР.

Выходзячы з вышэйпаказанага, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту пастанаўляе:

1. Прапанаваць Гарадоцкаму РВК і саветам больш рашуча перабудаваць работу саветаў у адпаведнасьці з новымі задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду народнай гаспадаркі, для чаго ў аддзелах РВК увесьці сацнамесьнікаў, арганізаваць інстытут грамадзкіх інструктароў з рабочых, калгасьнікаў—ударнікаў, якія выконвалі сацсумяшчэньне ў нерабочыя часы. Дабіцца сыстэматычнай плянавай работы сэкцый пры сельсаветах, групп беднаты, вытворчых нарад саўгасаў і калгасаў, пераносячы іх працу ў саўгасы, калгасы з уцягненьнем у іх савецкага актыву вёскі.

2. РВК працягваць чыстку калгасаў ад кулацкага элемэнту, разгарнуўшы вакол гэтага шырокую работу з беднатой, як у калгасах, так і аднаасобным сэктары, уцягваючы беднату ў непасрэдную практычную работу.

3. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на замацаваньне новаарганізаваных калгасаў, а таксама на іх узбуйненьне шляхам своячасовага адводу зямельных плошчаў, абагульваньня рабочай прадукцыйнай жывёлы, сродкаў вытворчасьці, правільнай пастаноўкі вучоту працы, перадачоў лепшы вопыт старых калгасаў і калгасьнікаў у новаарганізаваныя і адстаючыя калгасы.

4. РВК і сельсаветам у найхутчэйшы тэрмін забясьпечыць поўны пераход саўгасаў і калгасаў на зьдзельшчыну, мабілізуючы саўгасныя і калгасныя масы на падняцьце вытворчасьці, умацаваньне працдысцыпліны і лепшую пастаноўку вучоту працы. Шырока разгарнуць вакол гэтых мерапрыемстваў сацыялістычныя формы работы сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі і калгасьнікамі і брыгадны мэтад работы.

5. РВК пасіліць работу з жанчынамі і ўцягненьне жанчын у штодзённую практычную работу; палепшыць работу з актывам, асабліва ўзьняць ролю сельскіх і раённых бытавых камітэтаў; зьвярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю і палепшаньне быту жанчын у саўгасах і калгасах.

6. РВК і сельсаветам яшчэ больш разгарнуць работу сярод калгасьнікаў і бяднякка-серадняцкіх мас вёскі вакол уборачнай кампаніі з тым, каб у вызначаныя для кожнага сельсавету і калгасаў тэрміны былі выкананы, як у аграмаджаным, так і ў аднаасобным сэктары, уборачныя пляны па ўсіх відах культур; асабліва зьвярнуць пры гэтым увагу на своячасовую ўборку і апрацоўку лёну і кармавых культур. Усю работу ўборачнай кампаніі ўвязаць з правядзеньнем асеньняй сяўбы.

7. Улічваючы вялікую плошчу лёну ў раёне, прапанаваць Наркамзему і РВК ўжыць усе захады да поўнага сканчэньня пабудовы 3-х лёнаводных заводаў не пазней як да 1-га кастрычніка 1931 г.

8. Улічваючы значную ролю Гарадоцкага раёну, як тэхнічналёнаводнага і жывёлагадоўчага і слабую забясьпечанасьць яго спэцыялістамі (агрономамі), прапанаваць Наркамзему пры разьмеркаваньні спэцыялістаў новага выпуску накіраваць у Гарадоцкі раён ня менш 5-ці чалавек спэцыялістаў па сельскай гаспадарцы.

9. Улічваючы, што Гарадоцкі раён зьяўляецца адным з буйных лёнаводных раёнаў, і што да гэтага часу ў раёне няма мясцовай друкарні і газэты, лічыць неабходным арганізацыю ў найбольш кароткі тэрмін раённай газэты.

10. Даручыць Наркамзему і Лёнацэнтру забясьпечыць Гарадоцкі раён сельска-гаспадарчымі машынамі, у асаблівасьці лёнацерабілкамі, прымаючы пад увагу засеў вялікай плошчы лёну па раёне.

11. Даручыць РВК скарыстаць месячнік па праверцы беларусізацыі для ўзмацненьня работы па беларусізацыі апаратаў і абслугоўваньня нацыянальных меншасьцяй на іх роднай мове.

12. Маючы на ўвазе вялікае значэньне шляхавага будаўніцтва па раёне, прапанаваць РВК і сельсаветам яшчэ больш пасіліць работу шляхавага будаўніцтва з такім разьлікам, каб плян шляхавага будаўніцтва быў выкананы у вызначаны тэрмін.

13. Улічваючы вялікую адлегласьць паасобных сельсаветаў ад раённага цэнтру—да 70 клм.—і неадвальняючую сувязь апошняга з гэтымі саветамі, даручыць ўпаўнаважанаму Наркампаштэлю ўстанавіць тэлефонную сувязь у раёне.

14. Даручыць аргінстру прэзыдыуму ЦВК праверыць праз паўгода выкананьне гэтай пастановы і аб выніках дакладзіць Прэзыдыуму ЦВК.

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. Гнілякевіч.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР Б. Вансоўскі.

Працоўныя Менску даюць сродкі на стварэньне моцнага грамадзянскага паветранага флёту

Менскі гарадзкі савет ТДА-Авіяхіму праводзіць шырокую работу па дэкаднику грамадзянскай авіяцыі.

Па заводах і фабрыках праводзяцца сходы па гэтым пытаньні. Дзякуючы добрай растлумачальнай рабоце сярод рабочых і служачых ствараюцца фонды на ўзмацненьне грамадзянскай авіяцыі, наладжваюцца суботнікі ўпарадкаваньня аэрадрому і г. д.

Рабочыя заводу «Дрэваапрацоўшчык» 22 ліпеня арганізавалі суботнік у фонд грамадзянскай авіяцыі.

Рабочыя хлебазаводу адлічылі ў фонд пабудовы менскага аэрадрому 2 проц. месячнага заработку.

Работнікі і артысты дзяржаўнага цырку сабралі звыш 300 рублёў у фонд грамадзянскай авіяцыі і даручылі мясцкому арганізаваць ячэйку ТДА-Авіяхіму пры цырку і выклікалі пасьледваць іх прыкладу ўсе працуючыя зараз у Менску тэатры.

Дзяржаўны Беларускі Тэатр пачаў збор сродкаў у карысьць авіяцыі і мяркуе ў бліжэйшыя дні наладзіць пастаноўкі сродкі ад якіх пойдуць цалкам у карысьць грамадзянскай авіяцыі.

М. Б.

Хроніка дэкадніка дапамогі грамадзянскай авіяцыі

Па правядзеньні дэкадніка грамадзянскай авіяцыі ЦС ТДА-Авіяхіму БССР распрацаваны цэлы рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія ўжо даведзены да нізавых арганізацый.

Для больш чоткага і хутчэйшага ажыцьцяўленьня гэтых мерапрыемстваў на мясцох, усе інструктары ЦС ТДА-Авіяхіму выехалі ў гарады, раёны па аказаньні дапамогі нізавым арганізацыям ТДА-Авіяхіму.

Па БССР ужо сабрана на авіябудаўніцтва 250.000 руб.

Пры ЦС ТДА-Авіяхіму арганізавана авіялябараторыя, якая дае кансультацыю авіямадэлістам.

ЦС ТДА-Авіяхіму БССР выпушчан агітплякат на тэму аб будаўніцтве эскадрыльлі імя Леніна.

Адпушчаны сродкі на будаўніцтва авіяшколы ў Віцебску. У сувязі з тым, што гэта школа будуецца вельмі марудна ЦС ТДА-Авіяхіму зьвярнуўся з просьбай да НК РСІ, каб апошні забясьпечыў нармальнае будаўніцтва школы.

Дадзена дырэктыва нізавым арганізацыям ТДА-Авіяхіму па адборы лепшых ударнікаў фабрык, заводаў, саўгасаў і калгасаў у авіяшколы.

У хуткім часе будуць адкрыты паветраныя лініі Менск—Масква, Харкаў—Менск праз Гомель, і Ленінград—Кіеў праз Віцебск і Гомель.

Тыя весткі, якія паступаюць з месц, гавораць аб тым, што рабочыя, калгасьнікі і бяднякка-серадняцкія масы вёскі сустрэлі дэкаднік грамадзянскай авіяцыі з вялікім энтузіязмам.

Па ўсім гэтым прыкладным узорам работы паказваюць раённыя арганізацыі Віцебску, Бабруйску і Гомелю.

Б—ка.

НА ЗЛЫМКУ: 1. Заг. поштай на лёдаколе „Малыгін“ тав. ПАПАНЯН і яго памоянік тав. ПЯТРОЎ перад выездам з Масквы ў Архангельск; 2. Савецкі лёдакол „Малыгін“, які выходзіць у экспэдыцыю ў Арктыку; 3. Начальнік экспэдыцыі на „Малыгіне“ прафэсар ВІЭЭ; 4. Нямецкі цэпэлін (дырыжабль) ЛЦ—127, на якім утварэцца экспэдыцыя ў Арктыку; 5. Авіё-лёдакольная паштовая марка, якая выпушчана Наркампаштэлем спэцыяльна для сувязі ўдзельнікаў экспэдыцыі з надворным сьветам; 6. Кіраўнік навуковай часткі экспэдыцыі на цэпэліне савецкі вучоны прафэсар САМАЙЛОВІЧ

Экспэдыцыя ў Арктыку

За апошнія гады досьлед палярных краін ставіць сабе мэтай галоўным чынам вырашэньне многіх геаграфічных праблем. Асабліва значэньне ў гэтым напрамку мае скарыстаньне паветранага флёту, у прыватнасьці дырыжабля. Арганізаванае ў 1925 годзе міжнароднае таварыства «Аэраарктык» правяла палёт на Паўночнае канцавосьсе.

У сучасны момант праграма і мэта палёту відазьмяніліся і зьявіліся галоўным чынам да наведваньня мала дасьледваных краін Поўначы. Асабліва цікава дасьледваць вялікія натуральныя багацьці краін, якія знаходзяцца ў савецкім сэктары, як напрыклад раёны Паўночнай Зямлі, Таймыра і Зямлі Францы-Іёсіфа.

Гэтымі днямі з Ленінграду на паветраным караблі ЛЦ—127 вылятае экспэдыцыя па маршруце: Ленінград—Архангельск—Паўночная Зямля—Архіпэлаг Зямлі Францы-Іёсіфа—Арктыка і назад праз Новую Зямлю ў Бэрлін. (На зваротным шляху дырыжабль магчыма наведае Маскву.

Кіруе ўсёй экспэдыцыяй камандзір нямецкага дырыжабля ЛЦ—127 Гуго Экенэр, а кіраўніком навуковай часткі экспэдыцыі на міжнароднай канфэрэнцыі т-ва «Аэраарктык» абраны вядомы савецкі вучоны прафэсар Самайловіч.

Апроч праф. Самайловіча ў экспэдыцыі ўдзельнічаюць яшчэ тры савецкіх вучоных—праф. П. А. Маўчанаў, лепшы радыё-тэлеграфіст Арктыкі П. Крэнкель і інш.

Па ходзе правядзеньня экспэдыцыі будзе зроблены ціквы вопыт сувязі дырыжабля з лёдаколам. Савецкае т-ва «Интурист» зафрахтавала славуты савецкі лёдакол «Малыгін», які з групай замежных турыстаў, накіроўваецца на Зямлю Францы-Іёсіфа, ставячы перад сабой тры задачы:

Па-першае, — азнаёміць замежных турыстаў з Арктыкай, па-другое, высьветліць натуральныя багацьці Арктыкі з пункту погляду магчымасьці скарыстаньня іх, па-трэцяе,—«Малыгін» спаткаецца ў водах Паўночнага Ледавога акіяну з дырыжаблем ЛЦ—127, з якім будзе зроблен абмен поштай і, магчыма, пасажырамі.

Апошнія весткі кажуць, аб тым, што «Малыгін» ужо выйшаў з Архангельску ў напрамку Зямлі Францы-Іёсіфа.

Гэтымі днямі чакаецца прылёт у Ленінград нямецкага дырыжабля ЛЦ—127.

На Зямлю Францы-Іёсіфа апроч, «Малыгіна» едзе судна «Ламаносаў», якое на сваім борце вязе зьмену вімоўшчыкам на мэтэаралёгічнай станцыі.

У Архангельск прыехала кіно-экспэдыцыя, якая накіравалася на «Малыгіне» ў Арктыку з мэтаю засьняцьця гукавой кінафільмы аб Арктыцы. Кіно-экспэдыцыя абсталявана ўсімі неабходнымі прыладамі і будзе здымаць гукавы кіна-фільм апаратам удасконаленай сыстэмы савецкага канструктара Шорына.

Неабходна спыніцца на аднэй вельмі цікавай падрабязнасьці экспэдыцыі «Малыгіна».

Некалькі тыдняў назад, калі ўсяму сьвету зрабілася вядомым аб экспэдыцыі «Малыгіна», вядомы амэрыканскі падарожнік Антоні Фіяла, дасьледчык Арктыкі, зьвярнуўся да прадстаўніка «Интуриста» ў Нью-Йёрку з лістом, у якім выказаў упэўненасьць ў тым, што ў раёне выспы Рудольфа жыве вядомы дасьледчык палярных краін Роальд Амундсэн.

Як вядома, Роальд Амундсэн 18-га чэрвеня 1928 году вылецеў на самалёце «Латам» на дапамогу пацярпеўшаму аварыю дырыжаблю «Італія» і назад не зьвярнуўся. Пасьля раду, застаўшыхся бяз вынікаў пошукаў было рашано, што ён загінуў.

Антоні Фіяла паведамляе, што перад адлётам ён меў гутарку з Амундсэнам, у якой расказаў яму аб тым, што ў 1903 годзе ён, Фіяла, пацярпеўшы аварыю каля выспы Рудольфа, пакінуў там вялікі запас прадуктаў і прыладаў. Фіяла упэўнены ў тым, што вопытны Роальд Амундсэн, адзіны чалавек у сьвеце, які паведаў Паўночнае і Паўднёвае канцавосьсі, дабраўся да выспы і жыве так, як эскімос.

Выходзячы з гэтага паведамленьня, «Малыгін» накіруецца да самага паўночнага пункту Архіпэлягу Кронпрынца Рудольфа, які знаходзіцца на 82 градусе паўночнай шырыні, дзе будуць зроблены спробы адшуканьня Амундсэна і яго спадарожнікаў. Трэба спадзявацца, што «Малыгін» вернецца з тымі ці іншымі пэўнымі і канчатковымі данымі.

Г. С. Я.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ

25-7—31 г. а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца куставы сход асьветнікаў г. к. 1, 2, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 11, 13, МК, БАН, архітэктурнага тэхнікума; Белдзяржбібліятэкі, НК Асьветы, Інстытуту сац. рэканструкцыі, будаўнічага інстытуту, Інстытуту сьвінагадоўлі, запальнай станцыі, балотнай станцыі, Інстытуту прамысловасьці, Белпэдтэхнікуму, прафкому Белпэдтэхнікуму, прафкому Польпэдтэхнікуму.

Усе работнікі памянёных устаноў павінны зьявіцца з сваімі ўтрыманцамі.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ПЛЯН СПРАВАЗДАЧНЫХ СХОДАЎ МЕНГАРСАВЕТУ

Назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый	Час сходаў	Месца сходаў	Упаўнаважаны Гарсавету	Хто арганізуе сход
На 24-VII 31 г.				
16. Н.К.Ю., Ц. В. К., С. Н. К., Спраўдом ВСНГБ . . .	7 г.	Клюб саюзу дзяржустаноў	Кроль Я. М.	Раўтовіч
17. Утрыманцы ЦРК, Белпамсаюзу, Гарза, Райпрамсаюз, ЗРК, Мэталістаў, Швэйнікаў, Бальшавік	7 „	Клюб БКС	Налівайка М. Я.	Соскіна
18. Пітушкаадкормачны пункт (Антонаўка)	7 „	Антонаўка	Раманенка П. А.	Семанковіч
19. Рабач-омы ваенведу № 418	7 „	Сад будаўнікоў	Сідаровіч Я.	Уткін, Сіберт
20. Бэтонны завод	7 „	На заводзе (Бабруйская)	Шварц А. А.	Бацьвінік
21. Групкомы № 2, 5 і 6, 7, 8 саюзу грамадзкага харчаваньня	7 „	Сад, Універсытэцкая, 48	Бутомаў рад. Зьвязда	Групкомы П аўленьні арцеляў
22. Арц. „Пралетары“, „Новы Шлях“ (крав.), „Беларусь“.	7 „	Сад самахужнікаў, Камуністычная, 44	Якаўлеў А. Ю.	
23. З-д Д. А.	7 „	На заводзе	Яцкоўскі М. С.	Заўком
24. Эльвод	4 „	Клюб Эльвода	Хонік (ГСПС)	Заўком
На 25-VII 31 г.				
25. Швэйная ф-ка „Кастрычнік“	6 г.	Сад швэйнікаў	Пінхасік	Шульман
26. Групком мукамольнікаў .	7 „	Клюб імя Сталіна	Наўмёнак Я. Р.	Гр пком
27. Кіно-тэатр	2 „	Кіно „Чырвоная Зорка“	Рудзіцкі Б. Р.	Златкевіч
28. Дзяржплян.	7 „	Ленкуток дзяржпляну	Гольдбэрг С. Л.	Райхліп
29. Ц.Р.К.	7 „	Клюб саўгандльслуж.	Кумкес	Жылін
30. Менскі мясакамбінат . .	7 „	Камбінат	Карначоў А. М.	Залецкі
31. Групкому 1, 2, 4, 5, 6, 7, 8, 9 10, 11, 13, МК БАН., МК архітэктуры, палітэхнікум, МК дзяржбібліятэкі, МК б-кі Пушкіна, МК НК Асьветы, МК Інст. рэканстр. МК Будаўн. Інстытут, МК Сьвінагадоўлі, МК Занальн. станц., МК Балотнай станц., МК Інстытуту прамыслов., МК Белпэдтэхнікуму, МК Польпэдтэхнікуму, Прафком Белпэдтэхнікуму, Прафком Польпэдтэхнікуму . . .	7 „	Дом Асьветы	Камештэйн С. Д.	Гарпраўл. саюзу працасьветы, і т. Форэіман
32. Групком адзіночак № 1 .	7 „	Клюб будаўнік.	Партноў (гарсав.)	Файвішаў
33. Рабочком № 2, Цэнтрасклада будаб'яднаньня . . .	5 „	Сталовая скл. Ляхаўка	Ясюнія С.А.	Стальмашук
34. Мясцком Белсельбуду . .	7 „	Белсельбуд	Дзіканаў Х. С.	Фішар
35. „ ЦІПу	7 „	ЦІП, Шырокая	Дунец Х. М.	Рыбакоў
36. Тэлефон. станцыя, чыгуначн. паштаддз., Белар. кіраўніцтва сувязі, Менбуду, БКС.	7 „	Сад працаўнікоў сувязі	Плешакоў (ЦСПСБ)	Крупкіна
37. Шпалерная ф-ка, БАН (друкарня), СНК (друкарня), Камвуз (друкарня), ГПУ (друкарня). 1-шы групком, друкарня Зьвязда . . .	7 „	Клюб друкароў	Анопзін Я. Я.	ЦП саюзу, друкароў-паперыкаў
38. Ф-ка Беларуска	7 „	На ф-цы	Яцкоўскі	Фабком
39. Швэйн. ф-ка імя Крупскай, групком швэйнікаў, лябораторыя, БША	7 „	Клюб гарсавету	Шалкавец А. Л.	Шульман, Гурэвіч

Запаснымі дакладчыкамі на 24, 25, 26, 27 і 28—вызначаюцца: Руткоўскі М. Л. Саф'ян Я. М., Хаскін Р. Б., Эльперын Х. М., Эпштэйн А. Я., Сідранскі В. Л. Кроль М. Б. (нэр. клініка), Сабіла П. Я. і Дабравольскі С. Б.

МЕНГАРСАВЕТ

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Мендзяржтэатр — СЁНЬНЯ гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава. ПАЯЦЫ муз. ЛЕОНКОВАЛО. Балетны дывэртысмэнт. АНОНС—25 ТОСКА. Пачатак а 8 гадзін. Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк — Гастролі нямецкага ўкраіцеля ЛАЦІ з яго групай бэрбэрыйскіх ЛЬВОЎ. Працяг гастролай аўтамат-лялька—ФРАЗО. Паветраны палёт Валеціні. Апошнія дні прыгуноў—сальтамарталістаў Донвальдзі і шмат іншых нумароў. Пачатак а 8 гадз. 45 хв. увечары. Льготныя білеты ў рабкасе.

Дом культуры — Гастролі 1-га Дзяржаўнага Польскага Тэатру Украіны. 2 СІЛЫ 2. У 4-х дзеях. Пачатак а 8 з пал. г. Білеты ў рабкасе, а ў дзень спэктаклю ў Доме культуры з 5 гадз. Прымаюцца заяўкі на цэлевыя спэктаклі.

Кіно „Інтэрнацыянал“ — Ад 21 ліпеня М. Ю. Лермантаў на экране. Герой нашага часу КНЯЖНА МЭРЫ. Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.

Кіно „Пралетары“ — ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ. ЖОНКА ДОКТАРА БРЫАНА. Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

„Чырвоная Зорка“ — ПЕРШЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ. ПУЦЁЎКА У ЖЫЦЬЦЁ. Драма ў 34 эпізодах.

Усебелкантора Дзяржбанку абвяшчае, што АДЧЫНЕНЫ ПРЫЁМ у Маскоўскі вучотна-эканамічны інстытут, арганізаваны праўленьнем дзяржбанку, для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных работнікаў у галіне банкаўскай тэхнікі. За даведкамі аб правілах прыёму, таксама з заявамі аб паступленьні зварачацца ў Беларускую кантору дзяржбанку — гор. Менск у аддзел кадраў.

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ.

БЕЛДЗЯРЖСНАБ — даводзіць да ведама ўсёй кліентуры, што ніжэй пералічаныя аддзяленьні Белдзяржснабу ПЕРАЙШЛІ НА ПОУНЫ ГАСПАДАРЧЫ РАЗЬЛІК. Па ўсіх пытаньнях, зьвязаных са снабжэньнем, неабходна зьвяртацца толькі непасрэдна ў тое аддзяленьне, у раёне дзейнасьці якога знаходзіцца кліент:

Мейсца знаходжаньня аддзяленьня Белдзяржснабу	№№ к-к рахунку	Раёны дзейнасьці аддзяленьняў
Бабруйск	14	Гарады: Бабруйск, Слуцак, Рагачоў, Жлобін і ўсе раёны б. Бабруйшчыны
Віцебск	308	Гарады: Віцебск, Полацак, Сенна. Гарадок і ўсе раёны б. Віцебшчыны і Полаччыны
Гомель	15	Гарады: Гомель, Ветка, Добруш, Калінкавічы, Мазыр, Петрыкоў, Рэчыца і раёны б. Гомельшчыны і Мазыршчыны
Магілеў	63	Гарады: Магілеў, Быхаў, Горкі, Клімавічы, Крычаў, Лепель, Мсьціслаў, Ворша, Чавусы, Чэрыкаў, Шклоў і раёны б. Магілеўшчыны і Аршаншчыны
Менск	51/69	Гарады: Менск, Барысаў, Чэрвень і раёны б. Менш ыны

Уся перапіска, якая датычыцца да аддзяленьня, атрыманая дырэкцыяй Белдзяржснабу, а таксама і заяўкі разглядацца ня будуць і будуць накіроўвацца непасрэдна па аддзяленьням. ДЫРЭКЦЫЯ БЕЛДЗЯРЖСНАБУ.

Заняткі ва Ўсебеларускім палітыка-асьветным тэхнікуме (Магілеў н. д.) ПАЧНУЦЦА 1-га ЖНІЎНЯ. Студэнты, якія своячасова не зьявяцца на заняткі, а таксама арганізацыі, якія іх затрымаюць, будуць прыцягнуты да партыйнай, комсамольскай і адміністрацыйнай адказнасьці. Дырэктар П. Капаевіч

КАНФЭРЭНЦЫЯ КУРСАНТАЎ завочнага пэдагагічнага тэхнікуму АДКРЫВАЕЦЦА 1 жніўня ў памяшканьні Менскага Беларускага Пэдагагічнага Тэхнікуму (Менск, Савецкая, 107). 1-2-3

Загадам Дзяржаўнага ўсесаюзнага аб'яднаньня лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўваючых прадпрыемстваў на транспарце — ВАЛТ—НКШЗ, з 15 ліпеня 1931 г. утворан Транспартны Лясны Трэст Беларусі і Заходняй вобласьці „БЕЛТРАНСЛЕС“. ЯКІ АБ'ЯДНАЎ НАСТУПНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ: б. Паўночна - Беларускага раённага лясного кіраўніцтва НКШЗ — „СЕВБЕЛТРАНСЛЕСА“, разьмешчаных у межах БССР і Заходняй вобласьці: 1. Менскі, Невельскі і Калінкавіцкі лесазагатоўчыя раёны. 2. Барысаўскі, Азярыцкі, Смаленскі, Жалезьніцкі, Велясоўскі, Гарадоцкі, Какарэўскі 1-шы, Какарэўскі 2-гі, Хоцімецкі, Краснаборскі і імя Войкава—лесапільныя заводы. Месца знаходжэньня дырэкцыі—гор. Менск. Часовы паштовы адрас—Менск—таварная. Умоўны адрас для тэлеграм—Менск—БЕЛТРАНСЛЕС. ДЫРЭКЦЫЯ.

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе прыгавару Суду ад 2 красавіка 1931 г. па 107 арт. КК, за хуліганства ў нацыянальным выглядзе абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне гр. Грышчэнкаву Сямёну Іовічу.

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе прыгавару Суду ад 26 красавіка 1931 г. па арт. 196 арт. КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Ардашнікаву Якубу Аркадзьеву.

Магілеўскі Райгарсавет паведамляе, што ад студэнта Магілеўскага Белпэдтэхнікума Пішыка паступіла заява аб зьмене прозьвішча «Пішык» на прозьвішча «Камышоў».

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча, просьба паведаміць аб гэтым Магілеўскі райзагс, паказаўшы свае імя і імя па бацьку, прозьвішча і месца жыхарства.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44. Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Глаўлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА